Вулька-Нурэцкая ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960 NR INDEKSU 366714

МІХАЛ ТАМАШУК ☞ 8

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 19 (2608) Год LI Беласток, 7 мая 2006 г. Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Гаспадыня на камбайне

Стаіць у Паўлах аранжавы вясёлы дом, зараз за мастком ехаць трэба ў лугі па дарожцы выгнутай у лук. На разлеглым падворку яшчэ і малы домік — гасцінны, дзе ўсё вышыкавана як у гатэлі — гэта для родных, якіх да Марыі Галубоўскай, мамы і бабы, а нават прабабы з'язджае плойма. Бо пяцёра ў яе дзяцей, а рассеяліся па ўсім свеце. Праўнучкі па-галандску ўмеюць гаворыць, а беларуская іх кроў змешана з філіпінскай. І ўнуччына сястра там, і Гандзя, маці. Даччын сын памёр, дык паехала да дачок у тую Галандыю. А той муж унучын, дык і не польскай веры і не праваслаўны. Але Марка і Эрыка бацюшка хрысціў. І тут, па паўлаўскім падворку тупаталі малыя ножкі галандскіх праўнучкаў, цешылі бабу Маню. А іншыя ўнукі — у ЗША, там ёсць і сын Вітаўт, працуе ў Нью-Йорку. Займаецца тэхнічнымі справамі. Па Нью-Йорку на аўто ездзіць па заказах, ведае горад мо ўжо лепш за Беласток, дзе студыі канчаў, рускую з англійскай філалогіі. О, шмат памог быў Вітаўт і маці, і вёсцы.

— Гэта тады, як радным быў, — кажа Марыя. — Чатыры гады. Ваду сюды працягнулі, дарогу паправілі. Кожны радны стараецца перш за сваю вёску, таму трэба каб на свайго людзі галасавалі, што яго добра ведаюць. Думаў Віцька паехаць на Захад, крыху свету паглядзець, і ўжо там шосты год. Я іх не парассылала па свеце, яны ўсе самі паехалі. І дзядзька паехаў быў туды, і сястрын сын. Паехаў зяць мой, пасля дачка да яго, студыя кончыўшы... Цяпер іх дачка студыі там канчае. Замуж выйшла за амерыканца, з „зялёнай картай". Харошая пара. Працу знайшла. Ён польскі, але шлюб бралі ў царкве. У Польшчы засталіся — ось, Валодзя (толькі што ажаніўшыся Вітаўтаў брат-блізнюк), другі сын у Цеханове, і дачка найстарэйшая.

— Шэсць унукаў маю, і шэсць праўнукаў, — свецяцца бабуліны вочы. — Ось якая я багатая!

Сёння прыехала дачка Люба, разам з ёю з'ездзяць на паўлаўскія могілкі. На дварэ веснавое сонца сушыць зямлю, спяваюць пеўні. Старэнькі пародзісты руды сэтэр (дажывае свой век на вёсцы) памаленьку шпацыруе лапа ў лапу з коцікам. Бабуля Марыя глядзіць у акно — там на падворку зацвілі нейкія жоўтыя, на кароткіх сцяблінках нетутэйшыя кветкі (пасадзіла іх дачка), расце на полі тое, што пасеяла. Бо яшчэ яна тут гаспадыня. Хоць ад працы ледзь можа разагнуцца.

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

Марыя Галубоўская

— О, у ніякую Амерыку я не паеду. Мне тут Амерыка. Васьмідзесятка на носе. Адно думка яшчэ пра Вітаўта. Харошы, добры хлопец. Шкада, каб такі хлопец у самоце жыў. Добрыя мае блізнюкі. Ты бачыла Валодзеў дом? Сам сабраў грошы, сам будаваў. Усе мае дзеці студыі паканчылі. Гандзя настаўніцаю была, ужо на пенсіі. Усе да працы — па школе. Унучак Павел кончыў геаграфію ў Торуні, другі — пажарніцтва канчае ў Варшаве. Павел стаж адрабіў, адразу на працу яго ўзялі. Людзі бядуюць, што работы няма. А я смяюся: вы ў мяне безработныя не былі б, я ўсім вам тут работу знайшла б. Што, на вёсцы работы няма? Я работу ў сябе знайшла б. У мяне насеянага, наараванага! Мусі з пяць метраў жыта рассеянага! Быдла, парасяты, куркі... І катоў хіба з... дзесяць. І сабачка... І... „бізон". Ад'язджаў Вітаўт у Амерыку, купіў камбайн супольна з сябрам. То мне дарма пакосяць. Зарабляюць на гэтым „бізоне", але мне пакосяць. Віцька пытаецца час ад часу: далі вам пару злоты за той бізон? Кажу, не. От, скурчыбыкі. Не, кажу, не крычы, добра, што пакосяць.

Найбольш Марыі дачка дапамагае. Хоць у рабоце, усё час знойдзе. Затое як радня збярэцца — вось, якая радасць маці. Прыходзілі каляднікі, казалі: усю вёску прайшлі, столькі гасцей не бачылі. Пяць таксовак! Каляднікі заспявалі, а малечы кінуліся ў танцы. Дзеці залатыя — таму, што едуць.

— Кажуць мне суседзі: о, ты добрых дзяцей маеш. А каму ж дзеці кепскія? Што за матка была б, што сказала б, што дзеці кепскія? Слава Богу, трэба цешыцца. Унучак прыехаў прасіць на вяселле, аж з-за Цеханова ехаў. Дзе ж, кажу, я паеду, такая старая, скурчаная — табе ж сорамна будзе. — „Бабця, як можаш! Я сам прыеду па цябе і забяру на машыне! Ты для нас найважнейшая, ты мяне ўсяго навучыла! Табе адпачываць ужо пара, цешыцца адно". — А чаго тут мне адпачываць! Я з каровамі пагавару, з парасяткамі. Толькі дзверы адчыню — усё адзываецца. Прыйшоў сусед, заглянуў: з чым вы гаворыце? З каровай! А што мне, маю сядзець ля акна і выглядаць адкуль смерць прыйдзе? З Канюк ці з Міневіч, ха-ха? Чаго сядзець? Найлепш хадзіць, пакуль яшчэ жывы. То ў „будцы" пагрэбаюся (фольгу паставіла), то ў агародзе паграбуся. Учора пасеяла салат, радыску... Не надзяваючы акуляраў. Сын смяяўся, што я агарод прыгароджваю ўсё шырэйшы. Фундамент пад хатаю паправілі, печы перарабілі. Дажыву яксьці ў сваіх вялікіх пакоях.

Міра Лукша

Угодкі Чарнобыля ☞ 2

Віктар Сазонаў

Перад угодкамі Чарнобыльскай бяды, апазіцыянерамі вырашыла заняцца войска. І няважна, моцны ты фізічна ці кульгавы, снайпер ты або зусім нічога на бачыш далей уласнага носа, з малымі дзецьмі ці халасты, а войску нечакана стаў патрэбны менавіта ты, калі ты апазіцыянер. Толькі навошта гэтых зацятых, як многія з улады іранізуюць „свядомых", у армію браць?

Памяць Чарнобыля ☞ 2

Мацей Халадоўскі

У Варшаве па ініцыятыве прэзідэнта Леха Качынскага ў праваслаўнай кафедры св. Марыі Магдаліны была адслужана паніхіда па ахвярах Чарнобыля. У Мінску апазіцыя сарганізавала мітынг — як гэта акрэсліў лідэр апазіцыі Аляксандр Мілінкевіч — таксама ў рамках мірных акцый грамадзянскай непаслухмянасці ў дачыненні да рэжыму Аляксандра Лукашэнкі...

Пра Шчыты ☞ 4

Аляксей Мароз

Жыхары Шчытоў памятаюць аб мінулым сваёй вёскі даваеннага перыяду, якое апісваецца ў кніжцы айца Рыгора Сасны і Дарафея Фіёніка. Старэйшыя людзі захавалі станоўчыя ўспаміны аб сям'і Гаворскіх і ўладальніках маёнткаў побач вёскі...

Пра Боцькі ☞ 9

Аляксандр Вярбіцкі

У 1939 годзе, расказвае мне Антоні Турковіч з Боцькаў, немцы ў нашай мясцовасці не паявіліся. Прыляцелі толькі тры нямецкія самалёты і збамбілі некалькі жыдоўскіх мураваных дамоў, што былі ў цэнтры мястэчка; астаўся ад іх адзін друз. Драўляныя хаты жыдоў уцалелі. Уцалела таксама яўрэйская лазня, што над ракою Нурэц, аднак пасля праваліўся дах і цяпер асталіся толькі каменныя сцены...

Бельскія яўрэі ☞ 11

Міхал Мінцэвіч

У 1878 годзе на агульны лік 5 810 жыхароў Бельска яўрэяў было 3 968, а перапіс ад 1897 года паказаў 4 097 яўрэяў з агульнага ліку 7 464 бяльшчан. Пасля лік яўрэяў у Бельску падаў: у 1921 годзе было іх 2 392 (больш за 50%), а ў 1938 годзе — 38% агулу жыхароў. У 1939-1941 гг. у Бельску пражывала 6-7 тысяч яўрэяў...

9 770546 196000

Чарнобыльская рота

Ёсць людзі, якія праз доўгія гады пасля вайсковай службы з нейкім патаемным захапленнем любяць успамінаць менавіта вайсковыя часы. І такіх людзей нямала. Дастаткова ім прысесці за кілішкам гарэлкі, або з вудой ля рэчкі, або з сям'ёй на прыродзе, як яны бясконца апавядаюць пра дні сваёй маладосці ў салдацкіх мундзірах. Прычыны такога захаплення тымі гадамі, калі пагоны былі прадметам гонару перад супрацьлеглым полам, у кожнага свае. Хтосьці пасля службы так нічога ў сваім жыцці і не паспрабаваў зрабіць, чагось такога радыкальнага, актыўнага, смелага. Вось і ўспамінаецца маладосць з аўтаматам у руках. Іншаму падабаецца тое, што яго там цанілі, паважалі і шанавалі, бо давяралі не толькі падмятаць вуліцу, фарбаваць траву, самому засцілаць ложак, але яшчэ і страляць з аўтамата. Другі проста адпачываў ад таго, што нічога не трэба было думаць. Усё за цябе вырашаць іншыя. А ты толькі рабі што скажуць і ўсё тут. А нехта проста сумуе па тых часах, бо быў малады ды спрытны і здавалася яму тады, што наперадзе доўгае і шчаслівае жыццё. А тое жыццё пайшло не так, мары не рэалізаваліся, надзеі не спраўдзіліся. Дык хоць застаўся прыемны ўспамін пра тое, як думалася, што вось адслужыць і ўсё жыццё ў яго кішэні.

Прычыны настальгічна любіць тыя часы ў кожнага свае. Ад таго-сяго можна нават пачуць, што ён бы з задавальненнем яшчэ і паслужыў бы ў нейкай роце пры пяхоце. Але калі прыходзіць з ваенкамата выклік, які абавязвае чалавека прыйсці туды з ваенным білетам у руках і поўнай баявой гатоўнасцю ў сэрцы, большасць пачынае лаяцца брудными мацюкамі і чухацца кіпцюрамі па патыліцы. І зноў жа не таму, што войска страшнае, а таму, што ў кожнага сваё жыццё і свае прычыны на тое, каб яго не разбураць з-за таго, што нейкаму генералу салдатаў не хапае.

У Гродне апошнім тыднем многія так пачухалі патыліцу. Толькі надумаліся бацькам памагчы з бульбай ды гародамі, толькі вырашылі заняцца лецішчамі ды іншымі вясновымі справамі, як прыходзяць участковы міліцыянер з чалавекам з ваенкамата і пад роспіс даюць выклік. Хопіць, маўляў, адлежвацца, пакуль іншыя служаць. І абавязваюць прыйсці з вайсковымі дакументамі акурат дваццаць шостага красавіка. Менавіта тады, калі краіна адзначае дваццатыя ўгодкі Чарнобыльскай трагедыі, а апазіцыя ладзіць мітынг ды шэсце ў сталіцы Беларусі Мінску. Акцыя дазволеная ўладамі.

Дазволіць улады то дазволілі, але вось прымусілі ў гэты дзень прыйсці ў ваенкаматы не абы-каго. Выклікі пачалі „раздорваць" лідэрам і актывістам палітычных партый і грамадскіх недзяржаўных арганізацый. Тым, хто збіраўся на мітынг і шэсце.

Апазіцыянеры да ўсяго ўжо звыкліся. Як якая акцыя, то абавязкова кудысь выклічуць. То ў міліцыю, то ў пракуратуру. Падчас выбараў і Дня Волі ўвогуле пазакідвалі імі ўсе камеры ў ізалятарах часовага ўтрымання. Патлумачылі, што за дробнае хуліганства. Так напхнулі, што сапраўдным хуліганам не хапала месца. Ну а зараз, перад угодкамі Чарнобыльскай бяды, апазіцыянерамі вырашыла заняцца войска. І няважна, моцны ты фізічна ці кульгавы, снайпер ты або зусім нічога на бачыш далей уласнага носа, з малымі дзецьмі ці халасты, а войску нечакана стаў патрэбны менавіта ты, калі ты апазіцыянер. Толькі навошта гэтых зацятых, як многія з улады іранізуюць „свядомых", у армію браць? Наўрад ці яны там будуць спрыяць таму маральна-палітычнаму клімату, які там плануецца зрабіць.

Многія пачалі нават жартаваць, што апазіцыянераў забяруць у войска для таго, каб яны трохі рускую мову падвучылі, бо ўлады ўсё плануюць рэферэндумы пра нейкія саюзныя дзяржавы, а тут мноства людзей па-руску зусім размаўляць развучыліся. Усё па-свойму гаворацъ. Сорамна перад старэйшым братам.

Іншыя жартуюць, што адмыслова для беларускамоўных ствараецца асобная Чарнобыльская рота. Таму і выклікаюць у дзень Чарнобыльскай трагедыі. Для гэтай улады большай трагедыі няма, чым апазіцыя.

Застаецца ў завяршэнне, каб было трохі весялей, згадаць словы вядомага гумарыста Міхаіла Жванецкага. Калі ў яго нейкі раззлаваны генерал з падкавыркай запытаўся: „Што, артыст, гастралёр, усё жартуеш? А як вайна пачнецца, то дзе цябе шукаць?", Жванецкі спакойна адказаў: „Ну пачынайце, калі хочаце. Я пад'еду".

Віктар Сазонаў (Гродна)

Наша алімпіяда

Ужо ад добрых некалькіх гадоў я ўдзельнічаю (як адзін з членаў камісіі) у Алімпіядзе беларускай мовы. Добрае, сур'ёзнае і патрэбнае нашай тутэйшай беларускай моладзі і нашай меншасці мерапрыемства. Наша алімпіяда — гэта дадатковая моцная нагода да глыбейшага пазнання беларускай мовы, літаратуры, гісторыі і ўвогуле нашых агульнабеларускіх і тутэйшабеларускіх спраў. Гэта таксама дадатковая нагода спраўдзіцца і паказацца як вучню, так і настаўнікубеларусісту. І нарэшце, атрымаць ад гэтага немалыя практычныя карысці.

І трэба сказаць, што ўсе настаўнікі-беларусісты нашых беларускіх ліцэяў ставяцца да беларускай алімпіяды адказна, сур'ёзна, хаця гэта патрабуе ад іх і мноства дадатковага часу, і дадатковай працы. Не чутна таксама, каб яны наракалі ... І за гэта павінны ўсе мы сказаць ім — вялікі дзякуй!

Галоўнымі аднак героямі алімпіяды з'яўляюцца не настаўнікі і не арганізатары алімпіяды, а моладзь — удзельнікі яе. Цешыць, што прыступае іх штогод да алімпіяды многа. Сёлета, напрыклад, да другога этапа ўжо XII выпуску алімпіяды прыступілі 43 ліцэісты.

Моладзь наша (ну, лепшая частка яе) хутка дараслее, сталее, бо наш капіталізм змушае да гэтага. Ён не дае часу на расслабленне і „шпанаванне". Не хочаш, браток, астацца на абочыне жыцця — бярыся за работу адразу і ўжо змоладу трактуй жыццё сур'ёзна, адказна. Паспешна шукай таксама свайго месца ў жыцці, бо страчаны час вельмі цяжка даганяць...

Вось гэтыя жыццёвыя правілы многія з іх разумеюць, здаецца, добра. Таму многа працуюць над сабой і проста ўжо змоладу шукаюць сябе і сваёй жыццёвай дарогі... І менавіта моцна дапаможнай у пошуках сябе з'яўляецца наша алімпіяда. Дзякуючы ёй вучнёўская моладзь дакладней знаёміцца з беларускай мовай, літаратурай, гісторыяй, рэлігіяй, традыцыямі і жыццёвай мудрасцю беларуса...

Што ж найцяжэй даецца нашым ліцэістам? Усё залежыць ад вучня і яго падрыхтоўкі. Адным лепей удаюцца вусныя адказы, а другім — пісьмовыя працы. За пісьмовую працу можна атрымаць аж шэсцьдзесят пунктаў, а за вусныя адказы — максімум сорак. Усе шэсцьдзесят пунктаў атрымаць за пісьмовую працу ўдаецца, канешне, даволі рэдка, але і не бывае, каб зусім нічога не напісаць і нічога за пісьмовую працу не атрымаць. А на вусных экзаменах, на жаль, можа такое здарыцца. Проста, трапіць чалавек на непадрыхтаванае або вельмі мала падрыхтаванае пытанне. Максімальную ацэнку здараецца зарабіць аднак часцей за вусныя адказы, як за пісьмовыя працы, бо тут патрэбныя больш грунтоўныя веды.

У кожным аднак годзе паяўляюцца здольныя і працавітыя вучні, якім аднолькава ўдаюцца і пісьмовыя працы, і вусныя экзамены.

На аснове маёй практыкі магу сказаць, што многім вучням даволі цяжка даецца беларуская эміграцыйная літаратура. І гэта, канешне, не дзіва. З вялікім спазненнем мы пачалі вывучаць яе. Замала ёсць у нас выданняў эміграцыйных пісьменнікаў і добрай крытычнай літаратуры на гэтую тэму.

А цяпер аб карысцях. Апрача набытых дадатковых ведаў, удзельнікі алімпіяды вучацца таксама як весці сябе на экзаменах, змагацца з „трэмай", страхам перад і ў час экзаменаў. Да таго ж, многія з іх будуць звольнены з матуральнага экзамену па беларускай мове, што дасць ім больш часу на іншыя прадметы ў час матуры. Атрымаюць дадатковыя пункты за ўдзел у алімпіядзе, а некаторыя і ўвогуле будуць прыняты ў вышэйшыя навучальныя ўстановы без уступных экзаменаў...

Мне, прадстаўніку ўжо старэйшага пакалення беларусаў, радасна глядзець і слухаць як дастойна яны трымаюцца, выглядаюць і ўмела адказваюць на зададзеныя ім пытанні. Аб'ём ведаў, заключаных у пытаннях, шырокі: тут і літаратура, і граматыка, і гісторыя, і рэлігія, і нашы тутэйшыя звычаі і традыцыі. І спраўляюцца з імі многія з іх добра і вельмі добра.

Пахвальна, што многія з іх не толькі ахвотна выступаюць на розных школьных алімпіядах, конкурсах і іншых артыстычных мерапрыемствах, але таксама спяваюць у царкоўных хорах і з'яўляюцца актыўнымі членамі царкоўных брацтваў. Вось таму яны не толькі ахвотна раскажуць пра нашы народныя звычаі, традыцыі, але і прыгожа заспяваюць і народную, і апрацаваную, і рэлігійную песню. Усё гэта ўзбагачае іх і дапамагае стаць свядомымі беларусамі.

Васіль Сакоўскі

Вачыма еўрапейца

20 гадоў пасля

Гэта была адна з найбольшых трагедый другой паловы XX стагоддзя ў Цэнтральна-Усходняй Еўропе. Дваццаць гадоў таму — 26 красавіка а гадзіне 1.23 ночы рэактар у Чарнобылі стаў расплаўляцца. У тую ноч працаўнікі Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі спрабавалі паступова паменшыць моц рэактара. Выключалі пры нагодзе большасць аўтаматычных забеспячэнняў. Рэакцыя, якая развівалася ў рэактары, выйшла з-пад кантролю. Як пішуць спецыялісты, далі знаць аб сабе канструкцыйныя хібы. Унутры рэактара знаходзілася 1 500 тон лёгказагаральнага графіту. Гэта якраз ён выклікаў пажар і хімічны выбух. Ні ў адной краіне былога Варшаўскага дагавора не існавалі планы супрацьдзеяння паслядоўнасцям падобных катастроф.

Над Польшчу першая хваля забруджанага паветра дайшла каля поўначы з 27 на 28 красавіка. Адкрылі яе, аднак, пару гадзін пазней. Раней хваля даляцела над тэрыторыю Беларусі; горад Чарнобыль ляжыць на поўначы Украіны, на поўнач ад Кіева, пры вусці Прыпяці ў Кіеўскае вадасховішча, пры самой мяжы з Беларуссю. Дакацілася яна таксама над Скандынавію. Новы гвалтоўны рост выпраменьвання наступіў 3 мая. Гэта ў выніку паступовага прабіцця стрыжня рэактара ў памяшчэнні напоўненыя вадой. Хмара з таго другога выпраменьвання абмінула Польшчу і накіравалася на поўдзень Еўропы, над Грэцыю і Італію. 1 мая быў у Польшчы зафіксаваны спад забруджання паветра, але не грунту, пашы ці малака. Агулам забруджаных было каля 100 тысяч квадратных кіламетраў, з чаго аж 70% — на Беларусі. У адпаведнасці з сусветнымі даследаваннямі, на працягу першага года пасля аварыі ў Чарнобылі жыхары Польшчы атрымалі 11-працэнтную натуральную гадавую дозу праменявання. Ад паслядоўнасцей чарнобыльскай аварыі (асабліва на Украіне, Беларусі, Расіі і ў Польшчы) у найбольшай ступені пацярпелі дзеці да першага года жыцця. Каля 70-80% шкоднага радыеактыўнага ёду паходзіла з ежы, галоўным чынам з малака. Найбольш сур'ёзная і найчасцей трагічная паслядоўнасць аварыі ў Чарнобылі гэта рак, асабліва шчытавіднай залозы і белакроўе. Вядома, у Польшчы найбольш падвяргаліся ім жыхары ўсходняй Польшчы, але таксама прабываючыя на горных вяршынях. Адна з найбольшых доз праменявання зафіксавана пасля 26 красавіка на Снежцы. На няшчасце, мая мама ў той час якраз адпачывала на Снежцы і штодзень загарала ў яркім вясновым сонцы. Аб аварыі ў Чарнобылі даведалася пасля вяртання дахаты — у Беласток. Памерла некалькі гадоў таму — ад рака. Некалькі гадоў раней вядомы лекар праф. Іда Кінальская адкрыла ў яе гузкі на шчытавідцы. Ці гэта былі непасрэдныя паслядоўнасці Чарнобыля, не дасца адназначна даказаць. На думку віцэ-дырэктар Сусветнай арганізацыі здароўя Сузан Вебер-Мосдарф, лік памерлых ад рака, выкліканага забруджаннем пасля выбуху ў Чарнобылі можа сягаць 9 тысяч. У рапарце міжнароднай арганізацыі Greenpeace мяркуецца, што па прычыне розных захворванняў, якія можна лічыць узбуджанымі катастрофай, на Украіне, у Беларусі і ў Расіі памерла да гэтай пары каля 200 тысяч асоб. Галоўны эпідэміёлаг Расіі Генадзь Анішчанка сцвярджае, што паслядоўнасці аварыі ў Чарнобылі знікнуць за гадоў трыста.

З выпадку 20-годдзя гэтай трагедыі ўвекавечылі яе і на Украіне, і ў Расіі, і м.інш. у Польшчы. У Варшаве па ініцыятыве прэзідэнта Леха Качынскага ў праваслаўнай кафедры св. Марыі Магдаліны была адслужана паніхіда па ахвярах Чарнобыля. У Мінску апазіцыя сарганізавала мітынг — як гэта акрэсліў лідэр апазіцыі Аляксандр Мілінкевіч — таксама ў рамках мірных акцый грамадзянскай непаслухмянасці ў дачыненні да рэжыму Аляксандра Лукашэнкі. Паводле папярэдніх даных, спецслужбы затрымалі больш за дзесяць чалавек, у тым ліку лідэраў апазіцыйных партый: Вінцука Вячорку і Анатоля Лябедзьку. Гэты апошні быў таксама збіты. Непакорных дзеячаў Саюза палякаў Беларусі з Гродна якраз у гэты дзень прызвалі на ваенныя абучэнні. Гэтак было 20 гадоў пасля трагедыі ў Чарнобылі.

Мацей Халадоўскі

Вялікі скок вялікай Вулькі

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Разваліны калгаса

У Вульку-Нурэцкую дабіраюся ў канцы сакавіка з чыгуначнай станцыі Баравікі, апасаючыся, што больш такой нагоды можа не быць. З канцом сакавіка мяняецца ў нас расклад курсіравання паяздоў, а такія змены найчасцей у апошні час абазначалі свайго роду адлігу, пасля якой цягнікі знікалі як веснавы снег. Кандуктар у рэйкабусе не ведае, што будзе ездзіць за некалькі дзён, адсылае мяне чытаць газеты.

Канец сакавіка супаў у гэтым годзе з канцом зімы і жвіровая дарога ад чыгункі ў вёску прадстаўляе сабою зімова-веснавы пераплёт мокрага снегу з такім жа балотам. Дарога вядзе праз сасновы лес, які з'яўляецца своеасаблівай гісторыяй вёскі, паказваючы, як яна гэтаму лесу саступала. Між наймалодшых участкаў хваіны паказваюцца першыя хаты Вулькі-Нурэцкай, але яшчэ перад імі стаяць два крыжы з дыяганальнымі перакладзінамі.

Вуліца ў Вульцы-Нурэцкай, якая пачынаецца з дарогі ад чыгуначнага прыпынка, здаецца быць нязменнай ад стварэння свету, мо толькі грунт яе крыху наезджаны і находжаны. На адным з панадворкаў жвавуе падсвінак, быццам толькі што выскачыўшы з Ноевага каўчэга і яшчэ ніколі не прыйшло ў галаву загнаць яго ў хлеў пабудаваны паводле еўрасаюзных патрабаванняў.

Каля адной хаты бачу двух пажылых мужчын, заходжу на панадворак, пытаю пра іхнюю вёску. Інфармуюць мяне, што яны па сутнасці наймалодшыя ў Вульцы; абодвум пераваліла за шэсцьдзесят. Калі я гэтаму здзіўляюся і сумняваюся, папраўляюцца: ёсць яшчэ і шмат малодшыя за іх, але толку з іх мала; рэкамендуюць паглядзець тых малодшых у краме, што ў другім канцы вёскі. Дадаюць, што ёсць там яшчэ і клуб, які адкрыты амаль кожны вечар; там дзяжураць таксама тыя малодшыя.

Іду далей. Ад вуліцы адыходзіць вулачка ў бок лесу, што ад вёскі за ярам. Пад самым лесам старыя, з засыхаючымі вярхамі дрэвы, пад імі — крыжы. І на краю вуліцы, на разгалінаванні, ад якога адыходзіць згаданая вулачка, таксама крыжы. І на ўсіх іншых разыходах вуліц крыжы. Тыя крыжы не абы-якія, яны беражна задбаныя, згуртаваныя. На бетонных і драўляных распісаны свойскія малітвы за жыхароў вёскі. Тая беражнасць на ўсіх разыходах унушае думку, што тут людзі дбайна засцерагаюць вёску ад усялякай нячыстай сілы, каб яна не праціснулася ў ніводную вулачку. Калі я захацеў сфатаграфаваць адну такую групку крыжоў, жанчына, што праходзіла побач, з асуджэннем паставілася да майго намеру, да чужога чалавека, які, магчыма, можа такім чынам зняць з тых крыжоў іх засцерагальную моц.

На вуліцы паказваецца брук, на чарговым разгалінаванні — асфальт; вёска быццам цывілізацыйна прагрэсіруе з ходам вуліцы. Асфальт абыходжу, іду далей па брукаваным насціле. Мінаю хаты і з цэглы, і з драўніны; усе няновыя, у шматлікіх вокны глядзяць быццам старыя памутнелыя вочы. Не відаць брам, праз якія раз'язджалі б сельскія машыны. Большы драўляны будынак з роўным радком аднолькавых сумных акон здаецца быць ранейшай школай; у некалькіх крайніх вокнах фіранкі. Крыху далей пустая хата з кратамі ва ўсіх вокнах.

Заходжу да солтыса, пажылога чалавека, і яго распытваю пра вёску. У Вульцы-Нурэцкай чатыры гады раней гаспадары трымалі каля трохсот кароў: штодзённа тры фурманкі вазілі па сорак бітонаў малака ў прыёмны пункт у Тымянку. Калі малако сталі падводзіць пад вуніўныя стандарты, колькасць кароў рэзка ўпала і сёння іх асталося толькі каля дваццаці. Адзін гаспадар мае бак, а адзін далей возіць сваё малако ў Тымянку; можа вазілі б і іншыя, толькі ліміты знеахвочваюць. У вёсцы звыш дваццаці коней.

Водаправод праклалі мо з дзесяць гадоў таму. Ваду бяруць з гідрафора ў Тымянцы. У Вульцы таксама ёсць гідрафор, і вада з яго лепшая. Але ён быў збудаваны для калгаса і цяпер з'яўляецца ўласнасцю сельскагаспадарчага агенцтва. Гідрафор у Тымянцы таксама быў збудаваны для тамашняга калгаса, але ён быў перададзены гміне.

У Вульцы-Нурэцкай пражывае каля двухсот душ. Калісь Вулька налічвала шэсцьсот жыхароў і з-за гэтага называлі яе жартаўліва Хінамі. Да гэтага дадам, што таксама калісь у „Ніве" Віктар Рудчык, ураджэнец вось гэтай Вулькі-Нурэцкай і славуты ніўскі журналіст, пісаў пра паездку ў Беларусь, дзе адзін ягоны спадарожнік пацікавіўся, ці выпадкова не з'яўляецца ён кітайцам.

У вёсцы пустуе каля трыццаці хат. У згаданым мною шматаконным будынку ў сапраўднасці была калісь школа; калі яе закрылі, мой суразмоўца не ўмеў прыгадаць. Цяпер з Вулькі-Нурэцкай пяцёра дзяцей вучыцца ў школе ў Сяміхочах. А згаданыя фіранкі павешаны ў тым школьным памяшканні, дзе нядаўна адбываліся набажэнствы: у Вульку прыязджаў бацюшка з Зубач і правіў службу старэйшым вяскоўцам; цяпер бацюшка занядужаў і набажэнствы спыніліся. А ў хаце, дзе ў вокнах краты, была нейкі час крама, але яе ўласнік, з іншай мясцовасці, не ўтрымаўся на рынку.

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Вясковы клуб

Ад чарговага разгалінавання вуліц кіруюся на горку, дзе жанчына наводзіць веснавыя парадкі. Крыху далей паказваецца невялікая мураванка: пытаю жанчыну пра яе. Яна адказвае, што калісь быў там калгас, але не рэкамендуе мне туды хадзіць.

Іду, аднак, далей і перад маімі вачыма раскрываецца панарама вялікага калгаснага комплексу. Рэкамендацыі добрай жанчыны я не падпарадкоўваюся, але насцярожваюся. Згаданая мураванка аказваецца быць прахадной будкай на калгасны пляц; побач яе яма, дзе калісь была транспартная вага. Далей адміністрацыйны будынак з жудаснымі праёмамі, дзе калісь былі вокны.

Ступаю насцярожана далей, быццам па мінным полі, мінаючы круглыя зеўры памыйных ямаў. Іду па нейкіх рэштках аплеценых гніючаю травою падмуркаў, бо ж і тыя плішы з зеўрамі маглі ўжо зветрацца і толькі чакаюць нейкага штуршка, нейкай нагрузкі, каб разам з ёю праваліцца. Падыходжу да вялікага комплексу гаспадарчых будынкаў. Ад некаторых асталіся толькі апорныя слупы, іншыя захавалі першы паверх, апорныя слупы пакідаючы на другім. Адчуванне міннага поля займае адчуванне абставін разбуральнай вайны, бязлітаснага змагання часу з калгасным эксперыментам. Тут натуральная сцэнаграфія, дзе без вялікіх змен можна рабіць баталістычныя фільмы пра абарону Сталінграда або штурм Берліна.

Вяртаюся ў вёску. У некаторыя вулічкі, як у песенны ярок, цячэ вада ад таючага снегу, разліваючыся на ўсю іх шырыню; некаторыя іх адрэзкі трэба пераадольваць своеасаблівым фрыстайлам.

Выходжу на згаданы раней асфальт. Тут грамадскі цэнтр вёскі, дзе насупраць сябе вабяць крама і клуб, тут заварочваецца аўтобус, які двойчы ў суткі прыязджае з Сямятыч. На клубе шыльда пажарнага дэпо і вялікая аб'ява пра дыскатэкі. Дыскатэкі ладзіліся раней, цяпер, калі змяніўся арандатар будынка, забавы спыніліся. У краме трох мужчын, якім мо па сорак, мо па пяцьдзесят. І прадаўшчыца. Калі выходжу, усе прыклейваюць насы да шыбы.

Перад крамай мужчына з вялікім струпам на носе, відавочна ад вячэрняй слабасці ног; пытаю яго пра пажарнікаў. У вёсцы ёсць пажарная каманда, ёсць дзве помпы. Пажарнай машыны няма, помпы возяць на трактары, пажары тушылі ў сваёй Вульцы і ў Тымянцы.

Вулька-Нурэцкая адкрытая на Тымянку, сюды быццам акно ў свет, з гэтага боку яшчэ абрабляюцца палі. Але не ўсе ўчасткі, на некаторых красуюцца буйныя ўжо конусы самасейных хвоек. І асфальт на галоўнай дарозе ў свет палопаны, угінаецца пад нагамі.

Вулька-Нурэцкая паспрабавала калісь, не без уздзеяння звонку, здзейсніць рэвалюцыйную перамену свайго вясковага лёсу і выканаць вялікі скок у дваццатае стагоддзе. З тым скокам выскачыла з вёскі маладое пакаленне, а сама вясковая інфраструктура асталася і паволі пагружаецца ў тую эпоху, калі Адам з Евай былі яшчэ ў раю.

Аляксандр Вярбіцкі

Прыбіранне

Калі настане вясна і прыгрэе сонейка, усе людзі стараюцца ўпарадкаваць свае панадворкі, а дзеткі з гарадскіх школ ідуць прыбіраць паркі ды скверыкі. У Беластоку, напрыклад, прыбіраюць рачулку Белую і збіраюць з яе берагоў сотні кілаграмаў смецця, якое дарослыя штогод выкідаюць, нягледзячы на тое, што сродкі масавай інфармацыі амаль штодзённа бубняць аб ахове прыроды.

У красавіку давялося мне паехаць у Заблудаў да лекара. Пры нагодзе паглядзеў я на абочыны шашы ад вёскі Бялкі ў напрамку мястэчка. Пра тое, што дзеецца ў прыдарожных равах, аж сорамна пісаць. Валяюцца там розныя баначкі, пляшачкі, папера і пластмасавая ўпакоўка з-пад розных напояў. Тое ж самае назіраецца на іншых лакальных дарогах. Перад праваслаўнай Вербніцай, калі я пайшоў зрэзаць некалькі вярбовых галінак пры дарозе з Бялкоў у Агароднікі, дык там таксама ў равах прыкмеціў вельмі многа рознага смецця. І тут пры адной і другой дарозе напэўна не будзе каму прыбіраць, бо адзіная школа ў гміне не зможа гэтага зрабіць. Калі б школа стала прыбіраць абочыны дарог, дык ім спатрэбіўся б цэлы месяц на прыбіранне. Забруджваюць дарогі жыхары гарадоў, пераважна выхадцы з вёсак, якія пабудаваліся ў гарадах. Едучы ў вёскі наведаць сваіх родных, яны звычайна пазбываюцца смецця ў прыдарожных равах.

Падумайце, дарослыя жыхары, і не забруджвайце нашай зямлі. Смецце трэба выкідаць на звалку.

Мікалай Лук'янюк

Вышываюць

Сёлетні агляд вышыўкі і карунак у Гайнаўскім доме культуры карыстаўся вялікім зацікаўленнем саматужнікаў Гайнаўскага павета. Прынялі ў ім удзел 33 чалавек, якія падрыхтавалі 300 прац, у тым ліку найбольш гафтаваных крыжыкам, іголкай ды машынамі. Найчасцей стваральнікі вышывалі пейзажы, партрэты, кветкі ды малых звяркоў (аленянятак, коцікаў). Шмат было карунак зробленых вельмі ж умела, тонка. Усе далікатныя, як павуцінкі. Людміла Карпюк з Дубіч-Асочных выканала гафт, выкарыстоўваючы пацеркі.

— Нашы творцы гэта, першнаперш, сталыя жанчыны, якія вышыўкай займаюцца шмат гадоў. Некаторыя з іх — як самі кажуць — дзеля таго, каб упрыгожыць жыццё, — паінфармавала Зінаіда Якуць, інструктарка пластыкі ў ГДК і арганізатарка выставы. Конкурсная камісія прызначыла пяць узнагарод і чатыры вылучэнні.

Узнагароды атрымалі: Валянціна Зялінка, Ірэна Кавальская, Людміла Карпюк, Вольга Давідзюк і Галіна Бірыцкая. Вылучэнні былі прызначаны Вользе Грыц, Крыстыне Русачык, Яніне Плеве і Міхалу Клімуку.

Выстаўку гафтаў і карунак майстроў Гайнаўшчыны можна глядзець да 20 мая г.г. **(мох)**

Пра мінулае Шчытоў

Частка двара, дзе жывуць Тымашыцкія, была рамантаваная

Жыхары Шчытоў памятаюць аб мінулым сваёй вёскі даваеннага перыяду, якое апісваецца ў кніжцы айца Рыгора Сасны і Дарафея Фіёніка. Старэйшыя людзі захавалі станоўчыя ўспаміны аб сям'і Гаворскіх і ўладальніках маёнткаў побач вёскі.

Мужчына, якога я спатыкаю ў Шчытах-Дзенцялове, прапануе заехаць у стары дом Гаворскіх. Былі яны ініцыятарамі праектаў па адукацыі і павышэнню ўзроўню жыцця насельніцтва Шчытоў. Вялікі драўляны дом непадалёк дарогі з Крывой у Орлю нядаўна быў адрамантаваны і адноўлены. Аднак захаваўся ў ім колішні выгляд і дзякуючы таму вылучаецца ён на фоне сучаснага вясковага будаўніцтва. Сустракае мяне старэйшая жанчына, ураджэнка Асоўкі, якая цяпер з'яўляецца ўласнікам хаты і навакольных палеткаў.

— Я пасялілася сюды толькі ў 1975 годзе. Пасля вайны маёнтак купіла сям'я Дамброўскіх. Жылі тут Ян і Міхаліна, якіх я даглядала. Пасля яны перадалі гэты дом мне. Спачатку быў ён накрыты гонтамі, а пасля замянілі іх шыферам. Апошнім часам я палажыла на дах атуліну. Трэба было мяняць таксама знішчаныя фрагменты канструкцыі даху, — кажа Ванда Бжазоўская, якая таксама рамантавала паверх дома.

Заўважыўшы, што я фатаграфую дом, на вуліцу выходзіць сусед Ванды, Мікола Паўлючук. Запрашае ён мяне ў хату і з ахвотай пачынае расказваць успаміны свайго бацькі, які працаваў у шчытоўскіх паноў.

— Мне запамятаўся расказ бацькі пра братоў Адольфа і Рурыка (пасля Уладзімір Тымашыцкі патлумачыць мне, што так у народзе называлі яго дзеда), якія валодалі панскім маёнткам. Выводзіліся яны з каталіцкай сям'і і Адольф злаваў на брата Рурыка, які ажаніўся з праваслаўнай дзяўчынай і перайшоў на праваслаўе, — пачынае расказ спадар Паўлючук.

Пасля мой суразмоўца тлумачыць, што ў Рурыка было чатыры дачкі, якія выйшлі за праваслаўных хлопцаў.

— Адольф ажаніўся з жанчынай, якая хацела яго атруціць. Заўважыла гэта кухарка і пан выгнаў сваю жонку, якая раней атруціла папярэдняга мужа, — распавядае Мікола Паўлючук. — Адольф пасля вайны не вярнуўся ў родны маёнтак, памёр у бежанстве.

Бацька майго субяседніка працаваў на панскіх палетках.

— У мінулым у маіх бацькоў было толькі 2 гектары поля. Разам з іншымі жыхарамі Шчытоў мой бацька Сямён араў панскія загоны, сеяў збожжа, жаў яго і выконваў іншыя палявыя работы. Не наракаў на паноў, але ў аднаго з іх адтэрміноўвалася заплата за работу па прычыне фінансавых клопатаў.

Мікола Паўлючук: мой бацька таксама працаваў у панскім маёнтку

Цікавяць мяне ваенныя і пасляваенныя падзеі ў Шчытах у дачыненні да панскіх маёнткаў.

— Сям'ю Астасевічаў вывезлі яшчэ пры саветах, а іх мураваны дом разабралі мясцовыя. Адбывалася гэта пад наглядам гмінных чыноўнікаў з Орлі, якім гаспадары плацілі за цэглу. Панскае поле можна было купляць мясцовым сялянам. Мы таксама дакупілі кавалак панскай зямлі, — гаворыць Мікола Паўлючук. — Меншыя маёнткі былі ў Тымашыцкіх, Антыховічаў і таму ім дазволілі застацца на месцы і гаспадарыць. Гэтыя дзве сям'і ў сацыялістычны перыяд гаспадарылі на высокім узроўні. Былі ў іх трактары, усялякія машыны і жылі яны заможна. Зараз Уладзімір Тымашыцкі і яго жонка Марыя — людзі ў старэйшым узросце, а дзеці іх раз'ехаліся. Пакінулі яны гаспадарку, а Пётр Антыховіч, які займае частку супольнага дома, таксама не апрацоўвае бацькоўскага поля. На іх зямлі гаспадарыць цяпер прыезджы фермер, які заняў у Шчытах шмат поля.

Хаця дарога са Шчытоў у маёнтак дрэнная, еду да спадкаемцаў герояў кніжкі. Месца, дзе знаходзіліся маёнткі, прыгожае, побач вялікага панадворка расце лес. Аднак адразу відаць, што гаспадаранне ў гэтым месцы спынілася. Нерамантаваныя гаспадарчыя будынкі нішчэюць. Частка вялікага старога дома, у якой жыве Уладзімір Тымашыцкі, адрамантаваная звонку. Гаспадыню Марыю Тымашыцкую спатыкаю я на панадворку. Не здзіўляе яе прыезд чарговага наведвальніка, які хоча паразмаўляць аб мінулым.

— Прыязджаюць да нас розныя людзі і хочуць фатаграфаваць наш дом. Прыбываюць таксама вучні, — кажа спадарыня Марыя і запрашае ў хату.

Уваходзячы ў дом бачу, што ўсярэдзіне захаваў ён даўні клімат.

— Мяне і сястру ў 1941 годзе вывезлі ў Савецкі Саюз, а бацька быў тады ў турме. Калі маладых хлопцаў прымалі ў армію Андэрса, я быў яшчэ замалады, каб туды паступіць. Пазней прынялі мяне ў Касцюшкоўскую армію, з якой ішоў я ў Берлін, — кажа Уладзімір Тымашыцкі і паказвае больш за дзесяць ваенных медалёў і ўзнагарод.

Марыя Тымашыцкая, ураджэнка Шчытоў-Навадвораў, кажа, што муж вельмі любіў працу на зямлі і таму рашыўся вярнуцца на бацькаўшчыну.

— Вярнуўшыся дамоў, спачатку гаспадарыў я з бацькам на 30 гектарах. Пасля бацька аддзяліўся ад мяне і я застаўся на 10-гектарнай гаспадарцы. Пасля вайны мы займалі толькі частку дома, бо пасялілі ў ім перасяленцаў з-за Буга. Жылі яны ў нас доўга. Пазней перасяленцы памерлі, а іх дзеці выехалі адсюль, — тлумачыць Уладзімір Тымашыцкі.

Пасля мой суразмоўца павялічыў гаспадарку да трыццаці гектараў. Многа ў яго было лугоў і пашы, бо заняўся жывёлагадоўляй.

— Было ў мяне два трактары, камбайн і машыны для апрацоўкі зямлі. Збудаваў я абору, а калі тая згарэла, паставіў новую, — кажа спадар Уладзімір.

Калі фатаграфую дом, на панадворку працуе чалавек. Чысціць ён дарогу паміж аборай і клуняй. Гаспадарчыя будынкі пустуюць і ніхто з нашчадкаў не хоча заняцца гаспадаркай.

— Дзеці параз'язджаліся, — заяўляе Марыя Тымашыцкая і дадае, што ёсць магчымасць атрымаць фінансавую падтрымку, каб вярнуць колішні выгляд старога дома, але няма каму займацца рамонтамі.

— Дом наш быў збудаваны гадоў дзвесце таму. Жылі ў ім яшчэ сем'і Антыховічаў і Лызловых, — кажа Уладзімір Тымашыцкі.

З маёнтку вяртаюся я ў Шчыты іншай дарогай, каб абмінуць балота. На гэты раз заязджаю ў Шчыты-Навадворы.

— У нашай сям'і было 10 гектараў поля і таму я не чуў, каб мае бацькі хадзілі на заробак у панскі двор. Мне адзін раз прыйшлося рубаць дровы ў бацькі Уладзіміра Тымашыцкага. Хаця была ўжо народная ўлада, жыў ён яшчэ па-панску і да ўсіх прац наймаў людзей. Жыхары Шчытоў аралі яго поле, сеялі збожжа, жалі і малацілі. Нават выконвалі працы на яго панадворку, — гаворыць Грыгорый Шарала.

Тэкст і фота Аляксея Мароза

Храм на мяжы

Вёска Сынковічы знаходзіцца сёння на мяжы двух раёнаў — Слонімскага і Зэльвенскага. А ў гістарычных крыніцах ўпамінаецца ажно з канца XV — пачатку XVI стагоддзяў, калі была пабудавана царква-крэпасць. Яна, на думку некаторых даследчыкаў даўніны, збудавана ў пачатку XV стагоддзя. Але паданне кажа, што заклаў яе сам вялікі князь Вітаўт. І здарылася гэта вось з якой нагоды...

У 1377 годзе памёр вялікі князь Альгерд, які, па словах летапісцаў, „не столькі сілаю, колькі ўмельствам ваяваў". І пакінуў ён пасля сябе наступнікам любімага сына Ягайлу, які неўзабаве стаў каралём Польшчы. Пайшоў Ягайла вайною супраць свайго роднага дзядзькі вялікага князя Кейстута і сына яго князя Вітаўта. Аднак не змог іх адолець. Тады задумаў ён жорсткую хітрасць. Запрасіў да сябе дзядзьку і брата і пакляўся, што не зробіць ім зла. А як толькі яны, паверыўшы ў клятву, прыехалі ў Вільню, паланіў абодвух. Вітаўта спачатку каля сябе пакінуў, а вялікага князя Кейстута загадаў у ланцугі закаваць і кінуць у вежу Крэўскага замка. Яшчэ праз некалькі дзён служкі Ягайлавы забілі слаўнага Кейстута. Потым у Крэўскі замак прывезлі і Вітаўта з жонкаю...

Вось як пра гэта цікава напісаў слонімскі пісьменнік Уладзімір Ягоўдзік у сваім 2-томніку „Выбранае" (Мінск 2005, т. 2, с. 129-130): „Сядзеў вялікі князь у Крэве пад моцнаю вартаю. Штовечар дзве кабеты прыходзілі сцяліць пасцель яму і княгіні. А пасцяліўшы, выходзілі. За дзвярыма пакоя неадступна стаяла варта. Пачула вялікая княгіня Вітаўтава ад людзей, што калі Вітаўт не ўцячэ з вязніцы, дык тое самае з ім учыняць, што і з бацькам ягоным Кейстутам. І навучыла яна мужа свайго князя Вітаўта пераапрануцца ў адзенне адной з кабет, што прыходзіла ім слугаваць, а з другою — выйсці непрыкметна з пакоя. Паслухаў жонку Вітаўт, надзеў на сябе жаночае ўбранне, незаўважна спусціўся з замка і ўцёк да немцаў у Прусію".

Але ў Прусію князь адразу не трапіў. Заблытваючы сляды ад Ягайлавых служак, ён пусціўся наўцёкі зусім у адваротны бок — да старажытнай Літвы, што знаходзілася тады за Наваградкам. І непадалёку ад Слоніма, у ціхай лясной вёсачцы Сынковічы, князь Вітаўт знайшоў сабе надзейную схованьпад сялянскай страхой.

Праз дваццаць пяць гадоў пасля ўратавання ад немінучай пагібелі вялікі князь Вітаўт загадаў пабудаваць у Сынковічах храм: у знак удзячнасці Богу і тутэйшым людзям, якія захавалі яму жыццё. Невядомыя таленавітыя дойліды выканалі Вітаўтаву волю і паднялі да нябёс Сынковіцкую царкву-крэпасць.

У 1907 годзе польскі гісторык Юзэф Ядкоўскі зацікавіўся гісторыяй Сынковіцкага храма. Ён прыехаў у Сынковічы і ў архіве царквы выявіў „Генеральную візіту" 1720 года, метрычны запіс з 1762 года і апісанне царквы, складзенае кобрынскім ігуменам Андрэем Бянецкім у 1746 годзе. Традыцыйна лічылася, што Сынковіцкая Міхайлаўская царква была пабудавана ў 1407 годзе. Але паўстае пытанне: кім? І ніхто да сённяшніх дзён не можа на яго адказаць, бо няма сапраўдных дакументаў. Як адзначае польскі гісторык,

у актах Літоўскай метрыкі маецца вельмі цікавая грамата 1576 года, што датычыць Сынковічаў, а менавіта „Привилей пану Ивану Есману на торг в день недельный в именью его Сынковичах". Ім кароль Стэфан Баторый дазваляў у паселішчы кірмашы ў нядзелю і корчмы, пазбаўленыя збораў на карысць казны. Адсюль узнікае выснова: наладжваць кірмашы ў вёсцы, дзе няма царквы, было б недарэчна, таму факт існавання Сынковіцкай царквы ў 1576 годзе неабвержаны. А грамата была дадзена Есьману, верагодна, праз некалькі гадоў пасля заканчэння працяглага будаўніцтва храма.

Дарэчы, спасылаючыся на крыніцы, польскі гісторык Юзэф Ядкоўскі прыводзіць наступнае паведамленне: „Айцец Е. Міхайлоўскі на адным з малых званоў Сынковіцкае царквы знайшоў надпіс: «Anno Domini 1460»". А між іншым, ніколі званы не заказваліся задоўга да будаўніцтва храма, калі, можа, нават ідэі такой не існавала. Напрошваецца думка: храм у Сынковічах у час адліўкі звана ўжо мусіў існаваць і, можа, не адзін дзесятак гадоў. Таму, магчыма, ён сапраўды пачынаўся будавацца пры Вітаўту. А сама вёска Сынковічы яшчэ старэйшая за крэпасць-царкву.

У 1566 годзе вёска Сынковічы належала багатаму чалавеку Зэльвеншчыны Івану Есьману. А ўжо ў канцы XVIII стагоддзя і да 1939 года гэта была ўласнасць Пуслоўскіх. Праўда, леснічоўка каля Сынковіч належала Чапскім (Сынковічы былі падзелены на фальваркі). Доўгі час два фальваркі Сынковіч трымалі Франц Пуслоўскі і Казімір Есьман. І толькі ў 1920-х гадах леснічоўку прыдбаў граф Чапскі.

Абсалютную большасць Сынковіч складалі сяляне. Цяглыя сяляне былі надзелены поўным надзелам зямлі, з якога спаганяўся ўвесь комплекс павіннасцей. Паўцяглыя сяляне карысталіся паловай надзелу і адбывалі палавінную норму павіннасцей. А сяляне-агароднікі карысталіся толькі прысядзібнымі ўчасткамі, мелі нават дробную жывёлу, часам — каня. Архіўныя матэрыялы сведчаць, што ў маёнтку Сынковічы было ў другой палове XIX стагоддзя 4 двары агароднікаў, якія не мелі ніякіх гаспадарчых пабудоў і буйной рагатай жывёлы, акрамя хаты і дробнай жывёлы. Вольныя сяляне маёнтка Сынковічы мелі 100 дзесяцін зямлі на 56 душ. А ў Пуслоўскага ў гэтай вёсцы было 32 душы сялянскіх бабылёў (парабкаў, без зямлі і свайго жылля).

Перад рэформай 1861 года і ў другой палавіне XIX стагоддзя таварны характар у Сынковічах набыло садаводства і агароднічтва. У гэты час у вёсцы з'явіўся першы магазін, некаторыя сяляне мелі сажалкі, трымалі па 3 свіней. А вось коней было на вёсцы няшмат — усяго 64, а валоў — ажно 334. Сынковіцкія сяляне займаліся таксама перагонам смалы і дзёгцю.

У пачатку XX стагоддзя (1905-1913 гг.) у Сынковічах дзейнічала вінакурная мануфактура. На прадпрыемстве працавалі 8 рабочых. У 1908 годзе мануфактура займела нават паравы рухавік. І калі ў 1890 годзе Сынковіцкі прыход, які ўваходзіў у склад Слонімскага павета, налічваў 1 555 жанчын і столькі ж мужчын, дзейнічала царква, то ў 1921 годзе ў вёсцы Сынковічы было ўжо толькі 145 жыхароў. Многія не вярнуліся з бежанства, загінулі ў І сусветнай вайне і падчас савецка-польскай.

А што датычыць Пуслоўскіх, Чапскіх і Есьманаў — то яны ў 1939 годзе, за два тыдні да прыходу на Слонімшчыну і Зэльвеншчыну савецкай арміі, выехалі ў Англію.

Сяргей Чыгрын

Амазонкі ў Бельску

Звыш года (з 11 студзеня 2005 г.) у Бельску дзейнічае Клуб амазонак, створаны па ініцыятыве жанчын, якія змагаюцца з пухліннай хваробай. Жанчыны кладуць націск на лячэбную прафілактыку і яе папулярызацыю ў час сваіх сустрэч.

Галоўнай мэтай клуба, як казала ягоная старшыня Галіна Рыбак, з'яўляецца ўсебаковая дзейнасць у карысць жанчын з анкалагічнымі клопатамі пасля мастэктаміі (хірургічнага выдалення малочнай залозы пасля выяўлення злаякаснай пухліны). Сядзіба клуба знаходзіцца па вуліцы 11 Лістапада, у Пасёлкавым доме культуры. На штомесячных сустрэчах удзельніцы клуба абмяркоўваюць бягучыя справы, ставячы націск на лячэбную прафілактыку. Жанчыны праводзяць сустрэчы ў звышгімназічных школах дзеля як найранейшага азнаямлення моладзі з патрэбай дбайнасці пра здароўе. Каб быць у курсе спраў яны ўдзельнічаюць у розных курсах і семінарах, напр., ладжаных беластоцкім цэнтрам анкалогіі. Усведамляюць, што апрача дзейнай рэабілітацыі патрэбная таксама рэабілітацыя псіхічная і грамадская. З гэтай мэтай ладзяцца прэзентацыі навейшых пратэзаў і артапедычных гарсэтаў ды аздабляльных прыёмаў. Клуб ладзіць кантакты з іншымі арганізацыямі, напр., з Клубам сеніёра. У час канікул выязджалі на экскурсіі; наведалі таксама Драматычны тэатр у Беластоку.

У клубе займаецца цяпер каля дваццаці жанчын. На сустрэчах займаюцца яны не толькі лячэбнымі, але і, м.інш., юрыдычнымі праблемамі. Мерытарычную дапамогу, м.інш. дапаможнікі, буклеты ці часопісы, клуб атрымлівае з Федэрацыі польскіх клубаў жанчын пасля мастэктаміі з Познані, да якой належаць і бельскія Амазонкі. Але патрэбная і больш канкрэтная падтрымка, дзеля якой клуб патрабуе спонсараў.

Міхал Мінцэвіч

Грамадскае знішчаюць

Аўтобусны прыпынак у Трасцянцы, які знаходзіцца ў цэнтры вёскі (побач царквы і насупраць плябаніі) так знішчаны, што аж сорамна на яго глядзець. Сценкі прыпынка выкананы са шкляных кафелькаў-люксфераў, якія выглядам нагадваюць попельніцы для курцоў. На маю думку, у Трасцянцы няма столькі курцоў, каб яны пазабіралі сабе дахаты тыя квадратныя шкляныя кафелькі. Гэта, мабыць, „работа" хуліганаў, якія не могуць сцярпець, калі штосьці грамадскае ёсць у належным стане. А аўтобусны прыпынак — гэта ж месца, куды прыемна зайсці падарожніку, адпачыць ці схавацца ад дажджу і ветру. Затым, гарачы заклік да хуліганаў — не разбурайце таго што грамадскае і служыць усёй вёсцы.

Мікалай Лук'янюк

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі

Гражынка і Грак

- 23 -

Грак вярнуўся дахаты вельмі хутка. Проста, прыляцеў з новапазнанымі птахамі да кошычка, дзе было шмат смакоцця — каб пачаставаць іх мамінымі святочнымі вырабамі. Раздзяўблі нечаканыя госці вараныя яйкі, пірагі і вяндліны на бутэрбродах, адны крышынкі пакінулі, дый паляцелі. А Грак палез у аўто, сеў на руль ды звесіў дзюбу. За вокнамі мільгаў вясновы краявід, спадарства Казлы разам з Гражынкай пачалі падпяваць, а Граку ўсё больш рабілася млосна.

— У мяне марская хвароба, — пракаўтнуў сліну Грак. — Мне блага. Затрымайцеся, калі ласка, мне трэба на паветра.

— Ты што там балбочаш? — спыталася Гражынка. У гуле машыны не быў чутны хрыплівы басок Грака. — Ты, пэўна, нахапаўся свежага паветра. Не прастый часам?

— Не-е-е. Адчыні акно, Гражынка.

Дзяўчынка адсунула шыбу. Грак хацеў высунуць дзюбу навонкі, ды паветра адапхнула яго назад.

— Ты добра падумаў, Грак, што захацеў дахаты? Мог бы ты паляцець сабе на волю! — спадар Казёл ведаў добра норавы свайго ката спадара Шадара. Адно толькі адрознівала Грака ад Шадара — Шадар хадзіў сабе па волі колькі хацеў, адно толькі ў час пагрозы птушынага грыпу быў зачынены ў хаце. А Грак ужо год сядзеў дома, выглядаў праз фортачку, і займаўся адно хатнімі справамі. Праўда, бачыў увесь свет у тэлевізары і праз Інтэрнэт, але птушынага жыцця не ведаў ані-ані.

— Хутчэй дадому, хутчэй, — сап Грак, заплюшчыўшы вочы. Ад таго мігцення за акном, здавалася, усё ўнутры перавярнулася. І тыя хвіліны, калі лунаў у паветры, здаліся палётам у космас. Пасля вяртання з касмічных палётаў так мусілі адчуваць сябе касманаўты — віраванне ўваччу, няўпэўненасць ног ды крылаў (вядома, калі касманаўт быў крылаты)...

— Ой, мама! — пачала гаворку дома Гражынка. Грак паўляжаў на яе плячы. — Наш Грак лятаў!

— Ну, і што дзіўнага? — паглядзела на Грака мама. — А што з яго ножкамі?

— Ой, мама, — прастагнаў Грак. — Піць дайце. Вады... Вось, гэта і ёсць вясна, вясновае аслабленне арганізма. І вітамінак, калі ласка.

Міра Лукша

Нараўчанскія гімназісты з настаўніцай Ганнай Кандрацюк

Фота Г. К.

Мець свой розум

Аднойчы Міхась прачнуўся ў сярэдзіне ночы. Задумаўся над сваімі нядаўнімі паводзінамі і засмуткаваў. Ужо ведаў, што зрабіў вельмі дрэнна.

З самой раніцы Міхась выбраўся ў школу. Ён ведаў, што на другім уроку будзе пісаць кантрольную па матэматыцы. Учора яму не хацелася вучыцца. Ягоны сябра Толік таксама сказаў, што не вучыўся і не пойдзе ў школу на заняткі. Заахвочваў сябру пайсці разам на прагул. Міхась падумаў — добрая думка. Хлопцы зрабілі так, як дамовіліся. Пайшлі ў парк, а пазней думалі вярнуцца ў школу.

*

На ўроку матэматыкі настаўнік прыкмеціў, што няма двух вучняў. Паведаміў аб гэтым выхавацельку і бацькоў хлопцаў. Міхась ніколі не ўцякаў са школы. Усе вельмі хваляваліся.

*

Тымчасам хлопцы радаваліся, што не пішуць кантрольнай. Аднак Толік ужо не хацеў вяртацца ў школу, меў з сабой вопратку, грошы і крыху ежы.

— Пайдзі са мной, — прапанаваў. — Не будзем хадзіць у школу ды вучыцца. Будзем вельмі шчаслівымі, — казаў Толік.

— Я не ведаю...

— Ты што, баішся?

— Не, не баюся, — бараніўся Міхась.

— Дык давай, паедзем у сталіцу!

— Добра, але калі вернемся? — спытаў Міхась.

— Праз... тыдзень.

Хлопцы ўзялі свае рэчы і пайшлі на перон. Толік купіў білеты, яны селі ў цягнік і паехалі.

*

У школе кончыліся ўрокі. Настаўнікі і бацькі чакалі хлопцаў, але, на жаль, не дачакаліся. Рашылі паехаць дадому і там чакаць Толіка і Міхася. Ноччу знерваваныя бацькі паведамілі аб здарэнні паліцыю, бо хлопцы не з'явіліся.

— Добры вечар! — прывіталіся бацькі.

— Вітаю!

— Што здарылася?

— Нашы сыны загінулі, — пачаў бацька Міхася.

— Калі?

— Сёння. Яны не пайшлі на другі ўрок.

— І ніхто іх не бачыў?

— Не.

— Я гэтае знікненне магу спісаць, але шукаць іх пачнём пасля 24 гадзін.

— Не можаце?! Цяпер іх шукайце! — крычалі матулі.

— Заўтра пачнём іх шукаць!

Бацькі рашылі самі шукаць сыноў. Надосвітку, у парку яны натрапілі на кніжкі, што ляжалі пад лаўкай. Гэта былі Міхасёвы кніжкі. Бацькі зразумелі, што хлопцы... уцяклі.

*

Хлопцы, прыехаўшы ў сталіцу, пайшлі паабедаць. Паеўшы, пайшлі шукаць чагосьці цікавага. Хадзілі па горадзе цэлы дзень, але не падумалі пра начлег. Толік рашыў пайсці на перон і там пераначаваць. Міхасю ўжо не падабалася гэтая „экскурсія".

— А можа мы вернемся дадому? — спытаў Толіка.

— Што ты, дурны?

— А што ты хочаш яшчэ тут рабіць?

— Не ведаю, але не хачу вяртацца ў школу...

— Дык я вяртаюся заўтра, — адказаў Міхась.

— Ну, добра, паеду з табой. А цяпер спі.

— Добрай ночы!

— Добрай ночы!

Раніцай хлопцы прачнуліся вельмі стомленыя. Ім не надта добра спалася. Міхась быў хворы, меў высокую гарачку. Толік спалохаўся, не ведаў што рабіць. Ён не ведаў, што Міхась не можа спаць на двары, бо адразу захварэе. Толік хутка пабег і купіў білеты дадому. Узяў сябру на рукі і занёс у цягнік.

*

Бацькі і паліцыянты дакладна перашукалі парк і ваколіцу. Бацькі Міхася вельмі непакоіліся, яны ведалі, што іхны сынок не можа спаць на двары і баяліся, што так магло здарыцца. Не ведалі, як адчувае сябе Міхась і ці ён не хворы. Паліцыянты рашылі пайсці на перон і распытаць у падарожных, ці не бачылі двух хлопцаў.

(заканчэнне будзе)

Марта Федарук, I „б" кл. Ліцэя з беларускай мовай навучання імя Браніслава Тарашкевіча ў Бельску-Падляшскім

Галерэя дэкламатараў — НАРАЎКА 2006

Канстанцыя Дораш

Раман Копа

Паўліна Башун

Эвеліна Дунда

Тры Паўліны і Паўл

Канец красавіка і пачатак мая — рай для гімназістаў. Мова аб першакласніках і другакласніках. Калі іх старэйшыя сябры пішуць экзамены, у малодшых — выхадныя.

— Я б на вашым месцы не бушаваў па горадзе, — напамінаў Ян Дубаля, — толькі „падцягнуўся б” па матэматыцы. Канец школьнага года ўжо як рукой падаць. А вашы ацэнкі — лепш не гаварыць! Прыйдзецца адны двойкі і тройкі ставіць! Зараз у вас апошні шанц павысіць сваю сярэднюю на пасведчанні.

Падобныя заўвагі паўтаралі ўсе настаўнікі, нават Леў Катовіч, які з-за слабога здароўя выйшаў ужо на пенсію. Час ад часу экс-настаўнік наведваў школу і правяраў ацэнкі па хіміі. Найбольш балелі адзінкі ў яго любімцаў, якія апусціліся па невядомай прычыне.

— Ах вы, жулікі, — нерваваўся Катовіч, — і доўга наракаў на парадкі. — Няма ў вас дысцыпліны! Калісьці, — даказваў ён з настальгіяй, — такога гультая можна было пакараць. Нашпарыць у шкуру, або заперці на дзве-тры гадзіны пасля ўрокаў у школе. — Леў Катовіч крыўдаваў толькі на здольных вучняў. На апошніх махаў рукой:

— Варона і так ніколі не будзе арлом!

Тым часам у нашым класе выспявалі незвычайныя мары. У пачатку мая, калі набліжаўся г.зв. доўгі уік-энд, гімназісты збіраліся на экскурсію ў горы. Увесь вольны час яны прысвяцілі падрыхтоўцы. Таму хутчэй як за кніжкай, іх сустракалі ў супермаркетах. Асабліва кайфавалі дзяўчаты. Паўліна Ш. з Мартай цягам двух дзён шукалі модных рукзачкоў, Паўл з Марцінам швэндаліся па ўсім горадзе ў пошуках модных ботаў, а Паўліна Б. і Паўліна Ц. куплялі спадніцы ды каляровыя калготкі. І калі гімназісты выпадкова сустракаліся ў магазіне, яны свядома абміналі тэму навукі. Больш за ацэнкі на пасведчанні іх цікавіла падарожжа. Хто з кім будзе сядзець у аўтобусе? З кім паселяць яго ў гасцініцы? І як апрануцца на першую дыскатэку? І найважнейшае: якія новыя каханні ўспыхнуць пасля экскурсіі?

(працяг будзе)

Арабінка

Юр’ева абраднасць

Ужо не першы дзень свеціць яркае сонца, стаіць добрае надвор’е... Ужо дзяўчаты гукалі-заклікалі вясну, якая нясе „на зямельку травіцу, на травіцу расіцу, на лясочак лісточак, на дзевачак вяночак”. З кожным днём у земляроба прыбаўляецца клопатаў і працы. І вось свята Юр’я, прымеркаванае да 23 красавіка (па старому стылю), да Ягорава (Юр’ева) дня, які ў народзе лічыўся заступнікам жывёлы і гаспадаркі. У гэты дзень адбываўся першы выган хатняй жывёлы ў поле. Колькі ж тут селяніну трэба было ўсяго ведаць і прадугледзець! Яшчэ ў хаце гаспадыня тройчы абыходзіла з хлебам вакол коміна, каб „скацінка так стаяла на месцы, як печ стаіць”. Потым выконвалі шэраг абрадавых дзеянняў на двары: закрывалі замок, клалі яго каля брамы і выганялі жывёлу на вуліцу; ставілі поўнае вядро вады, каб так поўна было малака ў кароў; пры выгане коней клалі курынае яйка, каб яны былі гладкія і сытыя. Затым, памаліўшыся і ўзяўшы хлеб, соль, сала, яйкі, гаспадары гналі жывёлу ў агульны статак. Пастухі таксама маліліся, абыходзілі тры разы з хлебам вакол статка і пасля гэтага адпраўляліся ў поле. Там яны ладзілі святочны абед з абрадавымі стравамі.

На Юр’я абыходзілі палі, прыносілі ніве ахвяры, каб быў шчодры ўраджай. Маладзіцы, што ўзімку выйшлі замуж, пакрывалі ніву палатном. Моладзь жа не прапускала выпадку павесяліцца. Хлопцы і дзяўчаты абыходзілі двары ў сваёй вёсцы з віншаваннямі і добрымі пажаданнямі гаспадарам. У кожнай дзяўчыны, акрамя таго, было яшчэ і тайнае жаданне, каб гэты абыход быў для яе апошнім і да наступнага свята выйсці замуж. Замужнія жанчыны сталага ўзросту, управіўшыся па гаспадарцы, на цэлы дзень ішлі ў лес, адпачывалі, спявалі, гатавалі абрадавую страву — яечню.

Юр’я — светлае веснавое свята. Пануе прыўзняты настрой, селянін верыць: ад таго, як правільна і своечасова ён выканае ўсе асвечаныя традыцыяй абрады, будзе залежаць шчодры ўраджай на яго ніве, плоднасць статка, дабрабыт сям’і.

Таццяна Кухаронак

Польска-беларуская крыжаванка № 19

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку”. Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 15: Сеўка, католік, бусел, сыр, кава, ял, качан, базар, лязо, сардэчнік. Сябра, кабыла, тур, нос, кафэ, лекар, сілач, вафлі, фан, як, акардэон.

Узнагароды, набор каляровых аўтаручак, выйгралі: **Наталля Сцепанюк** і **Раксана Алексяюк** з Беластока. Віншуем!



Францішак Кабрынчук

Кашэчая музыка

Селі каты на плоце,
на інструментах іграюць
і на высокай ноце
цікаўных заклікаюць.

Трывожыць мышак вуха
з музыкамі сустрэча,
ўцякаюць каб не слухаць
той музыкі кашэчай.

Боты

Спрачаліся боты,
стоячы пад лавай:
каторы з іх левы,
а каторы правы.

З польскай пераклаў Віктр Швед

Бацькі наймалі да нас прыватнага настаўніка, які прыязджаў у Елянку з Дубіч. Вучыліся мы па беларускіх кніжках, а настаўнік напамінаў нам, што трэба хаваць падручнікі, калі ў хату прыйдзе паліцыянт...

Перад смерцю

Там, дзе побач Елянкі ў міжваенны перыяд знаходзілася поле, людзі сеялі збожжа і садзілі бульбу, зараз расце лес. У спадарства Тамашукоў перад вайной было 15 гектараў няякаснай зямлі, з якой трэба было выкарміць сям'ю.

Сеялі грэчку і лубін

— У міжваенны перыяд цяжка жылося. Гадавалі мы 3-4 кароў, 2 коней і некалькі свінак. Землі каля Елянкі былі слабой якасці і таму акрамя жыта мы сеялі яшчэ грэчку і лубін, які пасля прыворвалі і выкарыстоўвалі як зялёнае ўгнаенне. Палеткі ў нас былі вузкімі і доўгімі і таму складана было іх абрабляць. Зараз, калі праязджаю каля Елянкі, бачу, што на месцы нашых палеткаў шуміць лес, — успамінае Міхал Тамашук. — Толькі 12 злотых каштаваў перад вайной цэнтнер жыта, а каб купіць ровар, трэба было сабраць 120 злотых. Каштаваў ён удвая даражэй, чым у сярэднім каштавала карова.

Вучыліся крадком

— Спачатку трэба было давозіць вучняў з Елянкі ў Пачатковую школу ў Дубічах-Царкоўных. Аднак бацькі наймалі да нас прыватнага настаўніка, які прыязджаў у Елянку з Дубіч. Вучыліся мы па беларускіх кніжках, а настаўнік напамінаў нам, што трэба хаваць падручнікі, калі ў хату прыйдзе паліцыянт. Заняткі адбываліся па чарзе ў хатах і такім спосабам мы навучыліся чытаць, пісаць ды пазнаёміліся крыху з матэматыкай, — кажа Міхал Тамашук. — Пасля ў вёсцы адкрылі польскую школу і вучням трэба было вучыцца патрыятычныя польскія вершыкі. Запамяталася мне, што калі памёр Пілсудскі, тады ў школе была вялікая цішыня. Пасля наша настаўніца наладзіла нам экскурсію ў Варшаву. Бацькі завезлі нас у Чаромху, адкуль на цягніку дабраліся мы ў сталіцу.

— У верасні 1939 года немцы былі ў Елянцы коратка, затым у вёску прыехалі савецкія войскі. Брат Уладзімір быў старэйшы за мяне і таму яго забралі служыць у савецкую армію. Пасля ад брата не было ніякіх вестак і мы палічылі яго загінуўшым. Я нарадзіўся ў 1923 годзе і таму ўзялі мяне на працу. Трапіў я ў Чаромху, адкуль вазілі нас на работы ў лес. Загатаўлялі мы там дровы. За працу нам не плацілі, толькі кармілі нас. Працаваў я там тры месяцы і прыязджаў дамоў наведаць сямейнікаў. Перад прыходам немцаў у нашай хаце начаваў маёр савецкай контрразведкі, а каля вёскі стаялі рускія войскі. Якраз прыехаўшы з Чаромхі дамоў сустрэў я нямецкую армію, — расказвае Міхал Тамашук.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Міхал Тамашук часта ўспамінае чэрвень 1941 года, калі думаў, што чакае яго смерць

Ледзь не загінуў

У чэрвені 1941 года каля Дубіч-Царкоўных вяліся змаганні паміж нямецкімі і савецкімі войскамі і ў час іх загінулі немцы. Гэты час Міхал Тамашук успамінае з вялікім сумам.

— Я тады таксама ледзь не загінуў. Немцы ўехалі ў Елянку ад Кляшчэляў. Многія салдаты ехалі на веласіпедах. Калі мы з сябрамі завялі коней на супольную вясковую пашу і вярталіся дамоў, арыштавалі нас нямецкія вайскоўцы. Не ведалі мы нямецкай мовы і не маглі растлумачыць, што робім сярод поля. Прыгналі нас у родную Елянку і трымалі пад стражай усю ноч. Зранку загналі нас у Грабавец, а пасля ў Дубічы-Царкоўныя, якія пасля былі спалены. Закапалі мы каля царквы пабітых немцаў, затым прыгналі нас на істоцкія могілкі. Каля немцаў стаяў кулямёт і мы думалі, што нас тут застрэляць і пахаваюць. Сталі мы перад смерцю развітвацца паміж сабой, але пасля да вайсковых прыехаў афіцэр і загадаў забраць нас з могілак, — гаворыць устрывожаным голасам Міхал Тамашук.

Разам з савецкімі салдатамі Міхала Тамашука і яго сяброў загналі ў Гайнаўку.

— Рускіх салдат пагналі на чыгуначную станцыю і адправілі ў ваенны лагер, а нам трэба было дабірацца ў Бельск-Падляшскі. У дарозе былі мы галоднымі. У Бельску хацелі нас накарміць супам, але не было талерак і таму мы падмацоўваліся бручкай. Толькі там далі нам часовыя дакументы і сказалі вяртацца дадому. Паколькі мы не ведалі нямецкай мовы, не маглі высветліць прычыны нашага арышту і даведацца, ці сапраўды хацелі нас забіць на істоцкіх могілках. Спачатку дайшлі мы ў Маліннікі і там пераначавалі, а пасля дабраліся ў Елянку. Маці, якая нас сустрэла, заявіла, што пасля чатырохдзённай непрысутнасці аплакала нашу смерць, — кажа Міхал Тамашук.

У 1943 годзе Міхал Тамашук, нягледзячы на ваенныя дзеянні, ажаніўся і пераехаў на пастаяннае жыхарства ў Тапаркі.

— Калі на нашых землях была нямецкая адміністрацыя, трэба было працаваць на патрэбы немцаў. Згодна з маім узростам мелі мяне забраць на работу ў Германію. Аднак удалося пераканаць немцаў, каб аставілі мяне працаваць каля дома. Рамантавалі мы чыгуначны пуць, але работа не была асабліва цяжкай.

Працавалі на падатку

У пасляваенны перыяд у доме Тамашукоў у Елянцы працавала пачатковая школа.

— Пасля вайны таксама цяжка жылося. Калі мы не заплацілі ўсіх падаткаў, то прыходзіў секвестратар і нешта забіраў з дому. Адзін раз здарылася, што секвестратар сам зайшоў у камору і забраў воўну за незаплачаны падатак. Дараблялі мы ў пушчы, рыхтуючы дровы, — кажа спадар Тамашук.

У пазнейшы перыяд сям'і Тамашукоў, што жыла ў Тапарках, удалося збудаваць хлявы і гумно.

— Поле, якое мы з жонкай абраблялі, перайшло на дзяржаўную ўласнасць. Калі я пераходзіў на пенсію, трэба было аддаць усё поле. Калі б я пакінуў сабе зямлю, не атрымаў бы пенсіі, толькі далі б успамогу, — тлумачыць спадар Міхал і гаворыць пра сваё здароўе. — Я ніколі яшчэ сур'ёзна не лячыўся. Калі прастуджуся, перахаджу хваробу і яна мінае. Аднак хаця я не быў яшчэ ў шпіталі і сур'ёзна не хварэў, то памалу слабею.

Аляксей Мароз

Алесь АРКУШ

* * *

не раз задаваў сабе пытанне
чаму праўда такая слабая
а хлусня такая моцная
а сёння падумалася
праўда заўсёды слабая
на гвалт і прымус
і заўсёды моцная
на веру і справядлівасць

* * *

*

хлусня гэта драўляныя салдаты
Урфіна Джуса
без сэрца без спагады
не працягвай руку хлусні
не спрабуй з ёй паразумецца
бараніся праўдай

*

хлусня як атрутная жамяра
якая імкнецца ўджаліць
каб упырснуць сліну няверы
найлепшая прышчэпка —
трымацца свайго

*

у хлусні кароткія рукі
каб схаваць Каліноўскага
каб прымусіць маўчаць Купалу
каб забраць грамадзянства БНР
у Ларысы Геніюш

* * *

у Беластоку і Полацку
аднолькавыя ночы
толькі ў Беластоку
няма вялікай ракі
у якой адбіваюцца
зоры і месяц
толькі ў Беластоку
няма аўтобуснага прыпынку
на якім
позна ўвечары
чакаю цябе з сынам

* * *

чакаў
пакуль прыйдзе верш
а ён не прыйшоў
загуляў недзе
на беластоцкіх вуліцах
ці засядзеўся
ў багемнай кавярні „Castel”
а можа ён затрымаўся
на радыё „Рацыя”
дзе спрабаваў
упісаць свае радкі
між гарачых навінаў
мінулага дня

На сямейнай фотаздымцы пачатку XX стагоддзя Афанасій Данілаў зняты ў атачэнні ўсіх сваіх нашчадкаў. Гэтую „картку” яго ўнучка, сама ўжо бабуля, вельмі шануе...

З Лодзі ў Гродна

Жыве ў Гродне па вуліцы Веры Харужай звычайна-незвычайная бабуля Тамара (Тамара Нілаўна Дзетчына, у дзявоцтве — Мальцава). 60 гадоў назад сарваў яе лёс з наседжанага месца і прывёў у горад над Нёманам. Ці шкадуе яна аб гэтым — мне невядома. Але як гэта здарылася і з чаго ўсё пачыналася, я ведаю і вам раскажу.

У XIX стагоддзі, калі род Раманавых быў адным з самых паважаных у Еўропе, а Польшча і Беларусь былі часткай Вялікай Расійскай імперыі, забралі ў рэкруты простага чалавека з вяцкай губерні Афанасія Данілава. Верай і праўдай служыў ён Айчыне на польскай зямлі, а пасля, стаўшы чалавекам цывільным, вырашыў не вяртацца да сябе на радзіму, у расійскую глухамань. Застаўся ён у польскім горадзе Лодзь, закахаўся ў немку з імем кветкі — Разалія, ажаніўся. Гэты чалавек — дзядуля Тамары Нілаўны па мацярынскай лініі. На сямейнай фотаздымцы пачатку XX стагоддзя Афанасій Данілаў зняты ў атачэнні ўсіх сваіх нашчадкаў. Гэтую „картку” яго ўнучка, сама ўжо бабуля, вельмі шануе. На адваротным баку фотаздымка паслядоўна ўказаны імёны, прозвішчы, ступень роднасці членаў сям'і, каб не забыцца самой і каб унукі ведалі і сваім унукам перадалі.

Дачка Афанасія, Вольга, узяла шлюб з Нілам, таксама рускім (увогуле, рускіх у Лодзі было вельмі шмат). Аб цёплых і пяшчотных адносінах паміж маці і бацькам Тамара Нілаўна гаварыла мне так прыгожа, што хацелася слухаць і слухаць. А калі расказ падмацаваўся старымі фотаздымкамі, у мяне з'явіліся слёзы замілавання.

Слова за словам, мы пачалі гаварыць аб Другой сусветнай вайне. Увогуле, ці знойдзецца сям'я, па якой яна не прайшлася сваімі брудзнымі ботамі. Бабуля Тамара добра памятае акупацыю. Калі прыйшлі немцы, ёй было восем гадоў. У Лодзі пры немцах пэўны час працавалі рускія школы, але нядоўга. Таму маленькая Тамара, як і многія ўкраінскія і рускія дзеці, пайшла ў польскую школу. Усіх яўрэяў немцы адправілі ў гета. У вызваленыя кватэры ўсяліліся „фрау” са сваімі малымі, якія прыехалі з Германіі. Так вось і жылі з немцамі па-суседску, з нямецкімі дзецьмі сябравалі, нямецкія пайкі атрымлівалі. З-за гэтых пайкоў у рускіх з палякамі адбываліся сутычкі. Палякам давалі пайкі з маргарынам, усім астатнім — немцам, рускім, украінцам — з сапраўдным маслам. Таму і чулі рускія ў свой адрас пагардлівае слова „кацапы”. А яшчэ Тамара Нілаўна ўспамінае трамвай, вагон першага класа. Сітуацыя была такая, што ўсе, хто сядалі ў вагон першага класа, павінны былі гаварыць па-нямецку. Маленькая Тамара загаварыла па-польску, і хто цягнуў яе за язык? Але, дзякуй Богу, усё абышлося.

У 1945 годзе Вольга і Ніл Мальцавы вырашылі пераехаць на пастаяннае месца жыхарства ў Савецкі Саюз. Спакавалі валізкі, развіталіся з родзічамі і домам па вуліцы Глувнай, што ў цэнтры Лодзі, і разам са сваімі дачкамі селі ў таварняк, які накіроўваўся на Усход. Два тыдні дарожнай рамантыкі — і яны апынуліся на станцыі Гродна. Тут і вырашылі застацца, каб пачаць жыццё з чыстай старонкі.

Было складана. А каму ў той час было лёгка? Тамары было асабліва цяжка: яна не гаварыла па-руску. І нават цяпер, пасля 60 гадоў, яе „пальшчызна” з доўгім „л” часам праскоквае ў размове. Крок за крокам, год за годам... Сямігодка, вячэрняя школа, работа ў Дзяржбанку, сям'я, дзеці, унукі. Недзе далёка засталася радзіма, непрыкметна наступіў новы век. Гэта жыццё. Яшчэ ўчора дзяўчынка Тамара, сёння — ужо бабуля трох унукаў: Машы, Сярожкі, Андрэя.

Добрыя вочы ў бабулі Тамары. Усміхаецца, а ў кутках вачэй — слязінкі. Андрушка хворы — дзіцячы цэрабральны параліч, ён не ходзіць. У Польшчы такіх дзяцей ставяць на ногі. Але туды яшчэ трэба даехаць...

Наталля Антончык

Мяшчанскія Боцькі

У 1939 годзе, расказвае мне Антоні Турковіч з Боцькаў, немцы ў нашай мясцовасці не паявіліся. Прыляцелі толькі тры нямецкія самалёты і збамбілі некалькі жыдоўскіх мураваных дамоў, што былі ў цэнтры мястэчка; астаўся ад іх адзін друз. Драўляныя хаты жыдоў уцалелі. Уцалела таксама яўрэйская лазня, што над ракою Нурэц, аднак пасля праваліўся дах і цяпер асталіся толькі каменныя сцены.

Да вайны гандлем у Боцьках займаліся толькі яўрэі, якія ў 1931 годзе складалі каля трэці насельніцтва горада; гарадское права Боцькі страцілі ў 1934 годзе. Яўрэі ахвотна давалі тавар у борг (напавер), але калі хто задоўжваўся і не аддаваў, таму маглі спаліць будынкі.

Усе дзеці ў школе вучыліся разам. На рэлігію прыходзілі ксёндз і бацюшка, але рабіна не было відаць.

Савецкае войска прыехала на грузавіках, крыху пабылі, але гарнізона ў Боцьках не было. У пленэры, на белым палотнішчы паказвалі фільмы з фінскага фронту. У Сібір вывезлі Лукашэвіча, які меў трыццаць гектараў зямлі, а ягоная сям'я асталася; вывезлі яшчэ мо з пяць сем'яў. Саветы забіралі юнакоў у армію і многія не вярнуліся. Старшынёю сельсавета быў мясцовы чалавек, Лукашэвіч, які мірна пражыў нямецкую акупацыю і пасля вайны выехаў у СССР.

Царква ў Боцьках

У чэрвені 1941 года ў Боцькі ўварвалася на матацыклах дзевяць немцаў, якія стралялі да ўсіх, каго ўбачылі. Яўрэям выдзелілі два гета: адно ў цэнтры па вуліцы Браньскай і другое па вуліцы Залонскай. Калі іх вывозілі з Боцькаў, то рабін сказаў прамову, а пасля пагналі іх пяшком; немцы ехалі фурманкамі. Некалькіх яўрэяў уцякло, вайну ў Боцьках перажылі пяцёра, заканспіраваныя так, што ніхто пра іх не ведаў; пасля вайны выехалі яны за граніцу.

Аўтахтоннае насельніцтва немцы забіралі на прымусовыя работы ў Прусію, амаль з кожнага дому некага забралі. Паехаў і мой брат, якога пасля саветы забралі на фронт і з-пад Берліна не вярнуўся.

Нямецкі камісар жыў на пляцоўцы, забраў сабе нашы агароды і калі нейкая курыца туды заблукалася, то страляў да яе з двухстволкі.

Калі наступаў фронт, людзі хаваліся. Усе немцы выехалі, а нямецкіх жандараў з мясцовых хлопцаў пасля вайны судзілі; сядзелі яны па пяць-шэсць гадоў. Саветы забіралі ў людзей дабытак: коней для артылерыі і кароў для кухні. І нам забралі цельную карову. Гаварылі „Наши ребята воюют” і ад страты не было ніякага ратунку.

Пасля вайны тыя, што былі крыху вучаныя, сталі арганізаваць гандаль, ствараць ГС, ладзіць крамы ў пакінутых жыдоўскіх дамах. Іншыя яўрэйскія дамы заняло мясцовае насельніцтва, хто заняў, той і жыў; толькі да 1958 года трэба было тыя хаты выкупіць ад дзяржавы.

А калгасаў тут не арганізавалі. Жыхары Боцькаў лічылі яшчэ сябе мяшчанамі і такое прыніжэнне лічылі непрымальным. І ў суседніх вёсках, дзе жылі наследнікі шляхты, пра калгасы таксама не магло быць мовы.

Аляксандр Вярбіцкі

Беларусь апынулася „адной нагой" у другой палове мінулага стагоддзя, „другая нага" імкнецца крочыць разам з перадавым светам і перадавымі тэхналогіямі...

www.adukacyja.info

Чым далей адукацыя ў Беларусі адыходзіць ад сусветных стандартаў, тым больш увагі ў беларускіх універсітэтах і каледжах надаецца не ведам, а ідэалагічнаму шалупінню, чым менш у беларускіх ВНУ свабоды творчасці і выказвання думак, тым мацней у маладых людзей адчуваецца патрэба ў набыцці ведаў па-за межамі роднай краіны. Нягледзячы на тое, што ўласна Беларусь апынулася сёння „адной нагой" у другой палове мінулага стагоддзя, „другая нага" ў выглядзе прагрэсіўнай часткі беларускага грамадства імкнецца крочыць разам з перадавым светам і перадавымі тэхналогіямі. Менавіта для іх раз-пораз у Інтэрнэце з'яўляюцца сайты, прысвечаныя адукацыі за мяжой. Адным з такіх з'яўляецца „Інфармацыйны партал па адукацыі ў Цэнтральнай і Усходняй Еўропе".

Калі беларускі навучэнец ці студэнт нябярэ на сваім камп'ютэры адрас http://www.adukacyja.info, то перад яго вачыма адкрыецца жоўта-сінебелае выяўленне, на якім ён знойдзе шэраг магчымасцей для далейшага навучання альбо паглыблення ведаў па абраным прадмеце.

Сайт падзелены на звычайныя тры часткі. З левага боку — выйсці да шматлікіх рубрык. Дарэчы, гэтыя выйсці дублююцца і зверху. Правы бок аддадзены паведамленням аб хуткіх deadline-ах па заяўках на розныя навучальныя праграмы. Найбольш цікавай на галоўнай старонцы падаецца сярэдняя, большая частка, дзе распавядаецца пра апошнія навіны ў галіне навучання за мяжой для грамадзян Беларусі і не толькі.

Распрацоўшчыкі сайта, на жаль, нічога пра сябе і задачы гэтага Інтэрнэт-партала не распавядаюць на асобнай старонцы. Пэўна, мяркуюць, што пра ўсё мусіць здагадацца сам карыстальнік. Што ж, магчыма ўласнае ўражанне лепшая рэч у ацэнцы іх віртуальнага стварэння, але няблага было б неяк прэзентаваць саміх сабе.

Рубрыкі сайта дазваляюць не толькі пазнаёміцца з усімі апошнімі навінамі „замежна-адукацыйнай" накіраванасці, але і выбраць для кожнага, хто хоча працягнуць навучанне, адпаведную праграму і краіну. Напрыклад, рубрыка „Навіны" падзеленая на чатыры падрубрыкі, якія змяшчаюць інфармацыю па тэматычнай прыналежнасці паведамленняў. Гэта „Архіў навінаў", „Навіны сайта", „Беларускія навіны" і „Падпіска на рассылку". Дарэчы, партал вядзе адлік свайго часу ад мая 2004 года. Прынамсі, так вынікае з даты першых навінных паведамленняў.

Падаецца, што наступная рубрыка „Кансультацыі" не зусім адпавядае сваёй назве. Яна падзеленая на дзве падрубрыкі — „Інтэрв'ю з выпускніком" і „Форма зваротнай сувязі". У першай распавядаецца пра ўражанні некаторых студэнтаў, якім пашчасціла атрымліваць адукацыю за мяжой, а ў другой наведвальнік сайта можа задаць пытанне. Праўда, невядома пра што і каму.

Найбольш цікавай і насычанай інфармацыяй з'яўляецца рубрыка „Адукацыя". Менавіта яна перакрэслівае ўсе вышэйазначаныя хібы сайта і ўтрымлівае ў сабе вялікую колькасць патрэбнай практычнай інфармацыі па адукацыі за мяжой. Разбітая на шмат падрубрык, яна распавядае пра магчымасці паступлення і навучання як у беларускіх, так і замежных ВНУ. Вялікая ўвага надаецца паслядыпломнай адукацыі, навуковым працам, стажыроўкам, кароткатэрміновым праграмам і, нават, нефармальнай адукацыі, якая не прадугледжвае набыццё якога-небудзь пасведчання, але дазваляе фактычна паглыбіць свае веды ў рознага кшталту летніках.

Уладзімір Лапцэвіч

На чэмпіянаце свету, што праходзіць днямі ў нямецкім Брэмене, за азіяцкімі камандамі прабіцца на высокія месцы звышскладана...

Беларусь, беларусы...

Без расійскага комплексу

Беларуская каманда па настольным тэнісе на чэмпіянаце свету зноў прымусіла згадаць пра сябе як пра маленькую з'яву ў нацыянальным спорце. Не так часта нашы спартоўцы перамагаюць зборныя Расіі па гульнёвых відах спорту. А вось беларускія віртуозы пінг-понга адолелі расіян другі раз за апошні год. Значыць, дружына стратэга Аляксандра Пяткевіча ўмее справіцца з комплексам „малодшага брата".

Першым беларускім майстрам спорту ў канцы 1960-х стаў Уладзімір Зленка з Гродна. Пазней мінская каманда спартклуба „Трактар" перамагала ў розыгрышы Кубка СССР. За яе тады выступалі Іван Мінкевіч, Аляксандр Скуратовіч, Рыма Іофе. Мінкевіч і Яўген Шчацінін станавіліся чэмпіёнамі СССР у розных разрадах.

У канцы 1980-х пачала ўзыходзіць зорка Уладзіміра Самсонава. Ужо ў 11 гадоў ён стаў медалістам юнацкага чэмпіянату Еўропы. Пазней перамагаў на чэмпіянатах кантынента ва ўсіх намінацыях. Двойчы выйграваў Кубак свету і быў віцэ-чэмпіёнам свету, на яго рахунку процьма іншых прэстыжных тытулаў. У найноўшы суверэнны час і іншыя беларускія сталавікі здолелі раскрыць свой талент. Шчацінін станавіўся чэмпіёнам Старога Свету ў парным і камандавым разрадзе. Сярэбраныя і бронзавыя медалі еўрачэмпіянату ёсць у Тацяны Кастраміной і Вікторыі Паўловіч. Кастраміна была трэцяй у міксце ў 1998 годзе і другой з Вікай Паўловіч у 2002 годзе. Апошняя была да таго двойчы на трэцім месцы ў змешаным разрадзе (2002, 2003).

На чэмпіянаце свету, што праходзіць днямі ў нямецкім Брэмене, за азіяцкімі камандамі прабіцца на высокія месцы звышскладана, тым больш што беларусы прыехалі на першынство без цяжкатраўмаванага Шчацініна, неадменнага спадарожніка ўсіх камандавых дасягненняў. Гонар беларускай мужчынскай каманды бароняць Уладзімір Самсонаў (5-я ракетка свету), Віталь Нехвядовіч (415-я), Аляксандр Кучук (470-я) і Павел Платонаў (520-я), жаночай — Вікторыя Паўловіч (15-я), Тацяна Кастраміна (67-я), Вераніка Паўловіч (78-я) і Аляксандра Прывалава (535-я).

У стартавым матчы нашы мужчыны даволі сенсацыйна адолелі расіян — 3:2. На гэты раз Самсонаў прынёс толькі ачко, а сапраўдным героем стаў дасведчаны Нехвядовіч, які зусім нядаўна другі год запар выйграў чэмпіянат Беларусі і заслужыў месца ў зборнай. Перамог ён куды больш рэйтынгавых супернікаў — маскоўцаў Смірнова (29-я ракетка) і Кузьміна (47-я). Пасля гэтага Беларусь саступіла Ганконгу — 2:3.

Беларускія дзяўчаты ў чатырох матчах здабылі тры перамогі. З сухім лікам яны перамаглі Сербію і Чарнагорыю, а таксама Індыю. Куды большую каштоўнасць мае вікторыя над чэмпіёнкамі Еўропы (!) румынкамі — 3:2. А спабораваць на роўных з чэмпіёнкамі свету кітаянкамі пакуль не пад сілу нікому — 0:3. Жаночай камандзе застаецца згуляць з Чэхіяй і выхаванкі Тацяны Пяткевіч ужо забяспечылі месца ў ліку 12 мацнейшых дружын. У нашых хлопцаў кваліфікацыйнае заданне больш складанае. Усе тры астатнія супернікі — Тайвань, Славаччына і Грэцыя — прыблізна роўныя па класе, а ключавым і вызначальным можа стаць кожны паядынак. Важна не страціць месца ў вышэйшым дывізіёне, які складаюць 24 мацнейшыя каманды.

Уладзімір Хільмановіч

Мітрапалітык

— Тэма нашага сённяшняга семінара — ідэальны палітык. Палітык палітыкаў. Якім павінен быць кандыдат у дэпутаты, каб здабыць галасы большай часткі суайчыннікаў сваёй акругі дакладна ў той час, калі яны становяцца электаратам, — мяркуючы заінтрыгаваць прысутных адразу па тэме пачаў лектар. — Дык якім жа мусіць стаць гэты чалавек. Гэты суперпалітык. Я б нават сказаў — максіпалітык.

— Паколькі большасць насельніцтва Беларусі, нават у той момант, калі яны становяцца выбаршчыкамі, застаюцца па-ранейшаму праваслаўнымі, то я б гэтага звышпалітыка на ўсякі выпадак называў бы мітрапалітыкам, — жартуючы, унёс папраўкі ў лекцыю нехта з прысутных.

— Я бачу, што вы можаце аналізаваць, — пахваліў таго лектар. — Толькі сёння мы пагаворым пра знешні выгляд..., э-э, як вы там сказалі... мітрапалітыка. Цудоўна. Назва мне падабаецца. Бліжэй да тэмы. Большасць людзей галасуюць за тое, што бачаць. За ваш партрэт. За ваш знешні выгляд. Многія ўпершыню ўбачаць контуры вашай фізіяноміі толькі на выбарчым участку, на партрэце, які там будзе вісець. А людзі ў большасці сваёй цягнуцца туды, дзе больш святла.

— Як матылі ў вогнішча?

— Менавіта так! Таму знешні выгляд мае неверагодна вялікае значэнне. Каб з вас, звычайных местачковых палітыкаў, атрымаліся, як вы там казалі, мітрапалітыкі, папрацаваць трэба больш, чым над кульгавай смаркатай вясковай таўстухай, якая мусіць выйграць конкурс „Міс свету ўсіх часоў і народаў". Таму, як вы павінны выглядаць, вы мусіце ведаць лепш чым нумар сваёй выбарчай акругі. Што больш імпануе выбаршчыку? Упэўнены позірк Пазьняка, ці задумлівы выраз твару Вячоркі? Напорыстасць Калякіна, ці разважлівасць Шушкевіча? Спакой Мілінкевіча, ці гарачнасць Казуліна? Настойлівасць Лябедзькі, ці вашы сонныя морды на маёй лекцыі?

Пасля такога папроку прысутныя пачалі прасынацца. Гэтыя людзі, а з большага тут сабраліся лідэры рэгіянальных апазіцыйных структур, за свой жыццёвы вопыт засвоілі толькі адно выбарчае правіла — выбары выйграе той, хто лічыць галасы. І як ён выглядае выбаршчыкі могуць і не ўбачыць. Тым больш ніколі не даведаюцца, што той думае. Але такая заява лектара прымусіла іх пачаць актыўна шукаць аргументаў на карысць свайго вопыту. Тым больш, што прыехалі яны сюды ўбачыцца адзін з адным, а не слухаць нейкія навучанні. А лектар працягваў давіць на іх псіхіку, як дошка на вантрабянку.

— Паглядзіце на прысутных. Паўзірайцеся на сябе і на ўсіх вас і, паклаўшы руку на сэрца, шчыра адкажыце: за каго з тут прысутных прагаласавалі б вы?

Хлопцы пачалі круціць галовамі як бы кагосьці шукалі, упіваючыся пры гэтым вачамі ў твары і вопратку сваіх калегаў. Пасля ўчарашняга спаткання старых сяброў, якое ў беларусаў пакуль што мае толькі адну традыцыю адзначэння, фасадныя часткі галавы сапраўды не цягнулі на назву мітрапалітычных. Ды і іншыя дробязі, пачынаючы ад вопраткі і заканчваючы манерамі трымацца не выдавалі ў прысутных джэнтльменства.

— Агіднае відовішча, — падсумаваў убачанае Лявон. — Што да мяне, то я не прагаласаваў бы ні за адну ўбачаную тут морду, хоць даўно ведаю гэтых людзей як колер нацыі і з большасцю сябрую.

— Сапраўды, трэба быць больш уважлівымі да свайго знешняга выгляду, — падхапілі іншыя. — Тут лектар мае рацыю.

— Вось, — узрадаваўся той, хапаючы паперы і збіраючыся выходзіць. — Бачу маё навучанне не прайшло дарма. Рады буду ўбачыць вас у дэпутацкіх крэслах, а можа нават і ў прэзідэнцкім. І спадзяюся, што мая лекцыя дапаможа вам у гэтым.

— Дзякуй за добрае пажаданне, — неяк ці то з хітрынкай, ці то жартуючы хорам адказалі ўдзячныя вучні. — Каб не вы, то нізашто мы не выйгралі б. Дзякуй за пачутую навуку ад таго, хто сам ні разу ў выбарах не ўдзельнічаў. Вы ж бы прэзідэнтам сталі з вашымі ведамі. А мы вось зараз і пачнём абмяркоўваць як зрабіць так, каб для жанчын выглядаць як замежны альфонс, для старых людзей як надбаўка да пенсіі, для малых як добры чарадзей з цукеркамі, а для астатніх як дармовая пляшка гарэлкі.

— І яшчэ да вас ёсць адно пытанне, спадар Балдзею-ад-сябе, — звярнуўся Лявон да лектара, ўжо і так разгубленага апошнімі жартамі прысутных, — ці нават прапанова. На наступнай лекцыі, калі ласка, раскажыце нам, як гэта ўдалося выйграць выбары, прыкладам, Уінстану Чэрчылю, які яўна не прыслухаўся да вашых рэкамендацый.

Генрых Западашмянскі

Яўрэі ў Бельску-Падляшскім

Гістарычныя, а асабліва археалагічныя даследаванні паказваюць, што пачаткі горада Бельск-Падляшскі выходзяць з ранняга сярэдневякоўя. Паводле прыблізных ацэнак, у 1570 годзе ў Бельску пражывала чатыры тысячы жыхароў, а з прыгарадамі — пяць тысяч. Яўрэі паявіліся коратка ўжо ў XV ст., а іх устойлівае засяленне пачалося з пачаткам XIX стагоддзя. У 1921 годзе яўрэі складалі звыш 50% насельніцтва Бельска-Падляшскага.

У 1487 годзе кароль Казімір Ягелончык здаў у арэнду збор мытных аплат у Бельску двум яўрэям з Луцка. Тады яўрэйскай абшчыны ў Бельску яшчэ не было, пра яе існаванне і пра бажніцу згадваецца з 1542 года.

У 1564 годзе ў Бельску ўзніклі канфлікты між хрысціянамі і яўрэямі, якіх вырашэннем два гады пазней заняўся кароль Жыгімонт Аўгуст; яўрэі атрымалі новыя прывілеі, але гэта нядоўга трывала, бо спіскі з 1580 і 1591 гадоў не згадваюць пра яўрэяў.

У 1807 годзе Бельск перайшоў ва ўладанне Расіі і з таго часу пачалі там сяліцца яўрэі, якім забаранялася жыць у каралеўскіх гарадах; афіцыйны дазвол сяліцца ў Бельску яўрэі атрымалі яшчэ пад прускім панаваннем з пачаткам 1803 года. У 1807 годзе ў Бельску пражываў 31 яўрэй на агульны лік 1 836 жыхароў горада. Годам пазней было іх ужо 64, а ў 1816 годзе — 94. У 1861 годзе ў Бельску пражывала 1 256 жыдоў, якія маліліся ў трох бажніцах. У 1878 годзе на агульны лік 5 810 жыхароў Бельска яўрэяў было 3 968, а перапіс ад 1897 года паказаў 4 097 яўрэяў з агульнага ліку 7 464 бяльшчан. Пасля лік яўрэяў у Бельску падаў: у 1921 годзе было іх 2 392 (больш за 50%), а ў 1938 годзе — 38% агулу жыхароў. У 1939-1941 гг. у Бельску пражывала 6-7 тысяч яўрэяў.

Бельская ратуша ў мінулым; побач яе былі распаложаны яўрэйскія аб'екты

У Бельску яўрэі займалі цэнтр горада, галоўным чынам вакол рынку з ратушай; людзі тады сяліліся па кварталах паводле паходжання і прафесіі.

У самым цэнтры Бельска стаяла галоўная яўрэйская бажніца. Быў гэта вялікі драўляны будынак з двухпакатным чарапічным дахам. Фронт будынка аздаблялі шматлікія разныя дэталі і сімвалы, скрыжалі, галерэі. У вокнах былі каляровыя шыбы. Інтэр'ер, акрамя ажурнай трыбуны — бімы, быў просты. Вакол бажніцы, акрамя фронту, быў сад і агарод, своеасаблівы міні-парк з некалькімі лаўкамі для адпачынку. Гэтая раслінасць захіляла аб'ект ад празмернай цікавасці старонніх асоб. У час нямецкай акупацыі будынак галоўнай бажніцы быў знесены.

Побач галоўнай сінагогі была таксама невялікая бажніца нямногалікіх у Бельску крайне артадаксальных хасідаў. Непадалёк была і іншая бажніца, нетыповая, дзе ў галоўны малітоўны зал сходзілася па сходках, як у падвал. У алтары былі па-мастацку выразаны ўсе музычныя інструменты, якія ўжываліся ў старым іерусалімскім храме. Была яшчэ адна драўляная бажніца, побач якой была лазня, рэлігійная школа (ешыбот) і прытулак для сірот. У 1889 годзе пры перасячэнні вуліц Рынкавай і Прачысценскай (Пушкіна) быў адкрыты чарговы малітоўны дом. У бельскіх драўляных бажніцах былі малітоўныя залы для жанчын. У 1920 годзе была запраектавана будова вялікай бажніцы, але пабудаваць яе не ўдалося.

Старыя яўрэйскія могілкі (кіркут) былі ў цэнтры горада, іншыя — побач дарогі ў Браньск. Сёння няма ўжо ў Бельску ніводнай бажніцы; знеслі іх або нямецкія акупанты, або мясцовае насельніцтва пасля галакоста (як у Саколцы, Міхалове ці Кляшчэлях).

Міхал Мінцэвіч

Нас пазнаёміла „Ніва"

Ведала я, што на Беласточчыне жыве знакаміты святар айцец Рыгор Сасна. Бачыла цэлую паліцу ягоных кніг у бібліятэцы Музея беларускай культуры ў Гайнаўцы, чула аб ім прыязныя водгукі прыхаджан, з задавальненнем слухала аповеды пра бацюшку сваёй дачкі Наталлі.

Напрыканцы сакавіка адбылася мая сустрэча з айцом Рыгорам і матушкай Антанінай у Рыбалах. Найперш уразіла гасціннасць і сардэчнасць гаспадароў. А праз колькі хвілін здалося, што я ведаю гэтых людзей даўно, што бывала тут неаднойчы, хоць у гэтым накірунку ехала ўпершыню. Здзівіла ўсё: багатая жыццёвая мудрасць сужонства, бязмежны інтэлект абодвух, дапытлівасць і актыўнасць, з якой яны ставяцца да жыцця і да свайго месца ў ім, патрыятызм і адказнасць за справу, якой служаць.

Была я прыемна здзіўлена, што айцец Рыгор даўно ведае мяне дзякуючы „Ніве", на старонках якой друкаваліся мае допісы. Спачатку пацікавіўся, чаму не пішу ў газету. Параіў абавязкова працягваць супрацоўніцтва з тыднёвікам, бо падабаецца маё „пяро". Ад такога камплімента было цёпла і вельмі ўтульна на душы.

Развітваліся мы як старыя прыяцелі з надзеяй сустракацца надалей.

Сталася так, што на другі дзень пасля паездкі ў Рыбалы, у бібліятэку Музея ў Гайнаўцы завітаў Дарафей Фіёнік, асоба таксама неардынарная, вядомая далёка за межамі Беласточчыны. Пазнаёміліся. Прызнаўся, што ведае мяне даўно, бо таксама з'яўляецца прыхільнікам „Нівы", дзе неаднойчы сустракаў маё прозвішча.

Запрасіў наведаць ягоны музей у Студзіводах, падзяліўся творчымі планамі, падарыў на памяць нумар часопіса „Бельскі гостінэць", галоўным рэдактарам якога з'яўляецца.

Вялікі аматар фальклору, чалавек няўрымслівы і таленавіты, ён мне запомніўся з леташняга канцэрта, які ладзіўся ў музеі ў Гайнаўцы з нагоды свята, прысвечанага ільняной кашулі.

Новая сустрэча і знаёмства з гэтым чалавекам узрушылі мяне да глыбіні душы.

Так, дзякуючы „Ніве", якую паранейшаму люблю, я павялічыла кола знаёмых і аднадумцаў на роднай майму сэрцу Беласточчыне.

Дзякуй вам, добрыя людзі, за шчырыя словы падтрымкі, за адданасць „Ніве", за прыязнасць і цеплыню сэрцаў, за карысную справу, якую вы робіце на радасць людзям.

Тамара Лаўранчук, г. Высокае

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Nakład: 1 700 egz.
Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.
Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Сакратар рэд.: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран-Асташэвіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na III kwartał 2006 r. upływa 5 czerwca 2006 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na III kwartał 2006 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,50 zł, a kwartalnie — 45,50 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą: kraje europejskie — 5,00 (kwart. — 65,00), kraje pozaeuropejskie — 5,20 (kwar. — 67,60). Pocztą priorytetową: kraje europejskie — 6,00 (kwart. 78,00), Ameryka Półn., Afryka — 6,70 (kwart. — 87,10), Ameryka Połud. i Środ., Azja — 7,80 (kwart. — 101,40), Australia — 10,00 (kwart. — 130,00). Wpłaty: Rada Programowa Tygodnika „Niwa", BPH PBK SA O/Białystok 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.

FUNDACJA "MUZYKA CERKIEWNA"
HAJNÓWKA
FOUNDATION "OF ORTHODOX CHURCH MUSIC"

Program XXV Mikdzynarodowego Festiwalu Muzyki Cerkiewnej

Opera i Filharmonia Podlaska, Białystok, ul. Podleśna 2

INAUGURACJA FESTIWALU
2006.05.09 (wtorek), godz. 18.00
Otwarcie Festiwalu
Jubileuszowy Koncert Inauguracyjny „Arcydzieła Muzyki Cerkiewnej"
Koncert w wykonaniu laureatów MFMC: Męskiego Zespołu Muzyki Cerkiewnej z Warszawy pod dyr. ks. Jerzego Szurbaka
Kameralnego Chóru „Kijów" z Kijowa (Ukraina) pod dyr. Mykoły Gobdycza

PRZESŁUCHANIA KONKURSOWE
2006.05.10 (środa), godz. 17.00
Chór Towarzystwa Śpiewaczego „LIRA" — Warszawa
Dziewczęcy Chór „Ranica" — Mińsk (Białoruś)
Chór Daugavpilskiej Szkoły Muzycznej — Daugavpils (Łotwa)
Katedralny Chór „Carmen" — Białystok
Zespół „Kiedrowa" — Paryż (Francja)
Męski Chór „Radziwiłły" — Mińsk (Białoruś)
2006.05.11 (czwartek), godz. 17.00
Żeński Chór — Jarabina (Słowacja)
Mieszany Chór — Prużany (Białoruś)
Męski Chór — Kijów (Ukraina)
Mieszany Chór — (Serbia i Czarnogóra)
Mieszany Chór — Sankt Petersburg (Rosja)
Męski Chór „Gavriil Musicescu" — Kiszyniów (Mołdawia)
Chór Filharmonii — Dniepropietrowsk (Ukraina)
2006.05.12 (piątek), godz. 15.00
Miejski Mieszany Chór „Vardar" — Skopje (Macedonia)
Zespół „Dariali" — Tbilisi (Gruzja)
Mieszany Chór „Rodna Pesen" — Burgas (Bułgaria)
Męski Chór „Orfej" — Lwów (Ukraina)
Chór „Collegium Cantorum" — Częstochowa
Kameralny Chór — Astana (Kazachstan)
2006.05.13 (sobota), godz. 15.00
Bizantyjski Zespół Męski „Św. Efraim" — Budapeszt (Węgry)
Grupa Wokalna „Eufone" — Turyn (Włochy)
Bizantyjski Chór „Drama's Domestics" — Drama (Grecja)
Kameralny Chór Filharmonii w Homlu — Homel (Białoruś)
Chór Kameralny „Tawriczeskij Błagowiest" — Symferopol (Ukraina)
Chór „Credo" — Kiszyniów (Mołdawia)
Chór Kameralny im. S. Rachmaninowa — Tambow (Rosja)
2006.05.14 (niedziela) godz. 14.30 — ogłoszenie werdyktu Jury i wręczenie nagród
godz. 16.00 — Koncert Galowy
2006.05.14-17 — Forum Kompozytorów i Dyrygentów
Akademia Muzyczna im. F. Chopina Filia w Białymstoku Opera i Filharmonia Podlaska

ZAKOŃCZENIE FESTIWALU
Bazylika Katedralna w Białymstoku
2006.05.17 (środa), godz. 20.00
Koncert Jubileuszowy
„Jutrznia" Krzysztofa Pendereckiego wykonują soliści i chóry z Sankt Petersburga (Rosja)
oraz Orkiestra Symfoniczna Filharmonii Podlaskiej dyryguje Marcin Nałęcz-Niesiołowski

Organizator Festiwalu:
Fundacja „Muzyka Cerkiewna" przy współpracy z Operą i Filharmonią Podlaską

Вясна прабілася

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

„Даўціпы" Андрэя Гаўрылюка

У краме:
— Будзьце добры прадаць мне цюбік найлепшага клею.
— Калі ласка! Маем вельмі добры клей, толькі не можам адарваць яго ад паліцы.

* * *

У судзе:
— Чаму вы ўзламаліся ў гэтую краму два разы запар? — пытае суддзя абвінавачанага.
— Гэта ад уздзеяння сілы рэкламы. У гэтай краме вісіць лозунг: „Калі палюбіш нашы тавары, наведаеш нас яшчэ раз".

* * *

— Назавіце слабыя пункты вашага характару, — просіць кадравік кандыдата на працу, — напрыклад: ці п'яце гарэлку?
— Ну, не: піцця гарэлкі я ніяк не магу назваць маім слабым пунктам.

Адгаданка



Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — застольны „дэвіз".

1. украінскі горад на рацэ Стрыпе на паўднёвым схіле Падольскага ўзвышша, дзе ў 1672 годзе было заключана перамір'е між Польшчай і Турцыяй = 21 _ 24 _ 23 _ 22 _ 12 _;
2. астраўная дзяржава ў Палінезіі (167°E, 0°30'S) = 18 _ 11 _ 13 _ 10 _ 8 _;
3. урачысты верш прысвечаны важнай падзеі або герою = 2 _ 17 _ 14 _;
4. NaCl у кухні = 5 _ 19 _ 7 _ 4 _;
5. памяшканне для жывёлы і хатніх птушак = 1 _ 15 _ 16 _ 20 _;
6. рымскі імператар у 79-81 гг., які ў 70 годзе разбурыў Іерусалім або вучань апостала Паўла, які прапаведаваў на Крыце = 3 _ 6 _ 9 _.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 13 нумара

Гідра, дзень, дзіда, зіма, канец, пах, роў, сто, цень.

Рашэнне: **Дзе гаспадар не ходзіць, там ніўка не родзіць.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Яну Міхалюку** з Чыжоў і **Наталлі Шаршуновіч** з Гайнаўкі.

07.05 – 13.05

Баран (21.03. — 19.04.) Прыгажосць і сексапіль. 7-10.05. удасца табе ажыццявіць нават найбольш шалёныя ідэі. Любоўныя шаленствы могуць перакуліць твой свет! Не бойся рызыкі — добра інвеставаны грош можа прынесці фартуну.

Бык (20.04. — 20.05.) Усё, за што возьмешся, прынясе надзвычайныя эфекты. Але не пераборшчвай, асабліва ў час імпрэз. У твае парусы дзьме вецер. Быкі, якіх чакаюць экзамены, справяцца з зазубрэннем матэрыялу на пяць.

Блізняты (21.05. — 21.06.) Лавіна знакамітых ідэй трапіць табе ў галаву. Можаш іх выкарыстаць у сваёй фірме або разглянуцца за лепшай пасадай. 7-10.05. лепш не афармляць спраў патрабуючых эластычнасці, спантаннасці і творчага думання. Як гром на галаву можа табе зваліцца доўга скрываная таямніца.

Рак (22.06. — 22.07.) Энергія вясны проста цябе аж распірае. Да 9.05. чакаюць цябе новыя, захапляючыя жарсныя досведы, але і глыбокія, шчырыя размовы з партнёрам. З 12.05. больш крытыцызму і трапнасці ў ацэнках сітуацыі.

Леў (23.07. — 22.08.) 8-12.05. пазбягай шчырых прызнанняў, каб не выкарысталі іх супраць цябе. З 11.05. (аж да 15) не крыўдуй на партнёра, толькі скажы яму аб сваіх патрэбах. Адкрыеш у сабе залежы гарачых жарсцяў.

Дзева (23.08. — 22.09.) 10-13.05. знакаміты час на падарожжы, асабліва з каханай асобай. Да 10.05. не бярыся за рызыкоўныя вырашэнні і старайся не ацэньваць іншых. Дбай аб ногі, калі маеш праблемы з кровазваротам.

Шалі (23.09. — 22.10.) Здзейсніцца амаль усё, аб чым толькі замарыш. 7-10.05. справішся са справамі, на якія дагэтуль не было часу. Нават калі страціш працу, грошай хопіць.

Скарпіён (23.10. — 21.11.) Чакае цябе рамантычная прыгода. Дома рыхтуецца малы рамонт. Падзеі, якія пазітыўна ўплывуць на тваю псіхіку. Многа сілы, ідзе ўперад і амаль да ўсяго дойдзеш у планаваны тэрмін.

Стралец (22.11. — 21.12.) Шчаслівыя выпадкі, энтузіязм і змены, якія ў будучым давядуць да добрага. Выкарыстаеш усе нагоды, каб дасягнуць мэту. На працы зважай на інтрыганаў. Лёгка цябе звесці з розуму.

Казярог (22.12. — 19.01.) Рассяваеш вакол сябе такі чар, што ніхто не зможа вырвацца з твайго сіла. Без цяжкасцей зможаш дайсці да свайго. Экзамены пойдуць лёгка.

Вадалей (20.01. — 18.02.) Будзь асцярожны, каб не апарыцца — шукаючы кагосьці ад сэрца. Затое здароўе конскае. Да 10.05. будзеш адважны, дынамічны, ініцыятыўны, прадпрымальны ды рызыканцкі. 13.05. будзь асцярожны з рашэннямі. Не задзірай з асобамі, якія могуць зашкодзіць табе на працы.

Рыбы (19.02. — 20.03.) 8-12.05. — схільнасць да неабдуманых рашэнняў. Твае планы могуць прагарэць. Калі адчуеш сябе расчараваным жыццём, пашукай кагосьці, хто цябе адчаруе. Настрой паправіць банкавы рахунак. Мужчына Рыба будзе адважнейшы і выявіць свае доўга скрываныя пачуцці.

Агата Арлянская

ISSN 0546-1960